153. МОСКВА 19.
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИНСТИТУТ
СОР. СТРОИТЕЛЬСТВА
И ПРАВА
12.36

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 111 (5485)
НЯДЗЕЛЯ
17
МАЯ
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

У ЦК КП(б)Б.
ПАСЯДЖЭННЕ ПЛЕНУМА КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ КАМІСІІ ЦВК САЮЗА ССР.
ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — ПРАВЕРАЧНЫЯ ІСПЫТЫ Ў ШКОЛЕ.
Ф. ШПІГЕЛЬ — ПАСЛЯ ПЕРАМОГІ НАРОДНАГА ФРОНТА ВА ФРАНЦЫІ.
С. СЕМАШКА — ЗНАТНЫ ЧАЛАВЕК.
І. ТУРЭЦКІ — ЗУБАЎЦЫ.
ДРУГІ І ТРЭЦІ ТУРЫ ТРЭЦЯГА МАСКОЎСКАГА МІЖНАРОДНАГА ШАХМАТНАГА ТУРНІРА.

НОВЫ АБСТРЭЛ ЯПОНА-МАНЧЖУРАМІ СОВЕЦКАЙ ПАГРАНАХОВЫ.
ЗА РУБЯЖОМ:
«ЗА МІР, ХЛЕБ І СВАБОДУ!» — АДОЗВА КАМІТЭТА НАРОДНАГА ФРОНТА ФРАНЦЫІ.
ПІСЬМО ПАЛІТБЮРО КОМПАРТЫІ ФРАНЦЫІ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ.
АДСТАЎКА ПОЛЬСКАГА ЎРАДА.
ПАРТЫЗАНСКАЯ ВАЙНА Ў МАНЧЖУРЫІ.
ДАЛЕЙШАЯ АКУПАЦЫЯ ПАЎНОЧНАГА КІТАЯ.

Пасяджэнне пленума канстытуцыйнай камісіі ЦВК СССР

15 мая гг. пад старшынствам таварыша СТАЛІНА адбылося чарговае пасяджэнне пленума канстытуцыйнай камісіі, выбранай першай сесіяй ЦВК СССР VII склікання.

Камісія ўзяла пад дэтальны агляд прадстаўлены рэдакцыйнай падкамісіяй праект канстытуцыі СССР, устанавіла яго канчатковы тэкст і пастанавіла ўнесці яго на разгляд бліжэйшай сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР.

Праект канстытуцыі складаецца з 13 глаў:

глава I: грамадскае ўстройства;
глава II: дзяржаўнае ўстройства;
глава III: вышэйшыя органы дзяржаўнай улады Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік;
глава IV: вышэйшыя органы дзяржаўнай улады саюзных рэспублік;
глава V: органы дзяржаўнага кіравання Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік;
глава VI: органы дзяржаўнага кіравання саюзных рэспублік;
глава VII: вышэйшыя органы дзяржаўнай улады аўтономных совецкіх социялістычных рэспублік;
глава VIII: мясцовыя органы дзяржаўнай улады;
глава IX: суд і пракуратура;
глава X: асноўныя правы і абавязкі грамадзян;
глава XI: выбарчая сістэма;
глава XII: герб, сцяг, сталіца;
глава XIII: парадак змены канстытуцыі.

З прычыны хваробы сакратара канстытуцыйнай камісіі тав. І. А. Акулаве, камісія выбрала сакратаром камісіі тав. Я. А. Якаўлева.

ПРАВЕРАЧНЫЯ ІСПЫТЫ Ў ШКОЛЕ

Совецкія школьнікі перажылі радасны, поўны глыбокага зместу і інтарэсу навучальны год. Хутка ў школах пачнуцца іспыты і навучальны год закончыцца.

А год быў сапраўды выдатны! Партыя і ўрад і асабіста таварыш Сталін праяўляюць выключныя клопаты аб выхаванні дзяцей, аб тым, каб школьнікам даць новыя памяшканні, разгрузіць школы ад многазменнасці. Гэты год пачаўся з мерапрыемстваў па забеспячэнню школьнікаў падручнікамі і пісьмовымі прыладамі, каб вучань у школе атрымаў сапраўды глыбокія, канкрэтныя веды і, нарэшце, у гэтым годзе зусім нядаўна партыя і ўрад сваёй пастановай аб совецкім настаўніку паднеслі нашым школьнікам новы радасны падарунак.

Сапраўды, такая ўвага, такія клопаты аб школьніку, настаўніку можа праявіць толькі наша краіна, толькі партыя Леніна-Сталіна.

І вось навучальны год падыходзіць к канцу. 25 мая пачынаюцца праверачныя іспыты ў школе. Гэтыя праверачныя іспыты павінны будуць паказаць, наколькі палепшылася пасяховасць у школах, падвесці вынікі за прайшоўшы навучальны год.

Адначасова гэтыя праверачныя іспыты з'явяцца іспытамі і для настаўніка. Добра працаваў настаўнік, добра, умела вучыў ён дзяцей — добрыя будуць і рэзультаты іспытаў. Дрэнна працавала школа — нельга чакаць добрых рэзультатаў пры іспытах. Поспех іспытаў будзе рашаць прайшоўшы навучальны год.

Адсюль ясна, што праверачныя іспыты ў гэтым годзе набываюць асаблівае, выключна важнае значэнне. У працэсе іспытаў натуральна выявяцца ўсе дасягненні і недахопы работы школы за мінулы год. Лепшы вопыт трэба вывучыць, трэба вывучыць, як той ці іншы настаўнік дабіўся такіх добрых поспехаў, як працавала ўся школа, якім чынам яна дабілася добрых паказальнікаў. Гэты вопыт трэба вывучыць і зрабіць здабыткам для ўсіх школ на будучае. Адначасова трэба выявіць усе недахопы, якія перашкаджаюць нармальнай рабоце школы, з тым, каб у будучым гэтых недахопаў унікнуць.

Прайшоў год упартай, настойлівай вучобы дзетвары. Цяпер дзеці рыхтуюцца праверыць свае веды, адчытацца за прайшоўшы навучальны год. І для кожнага школьніка праверачныя іспыты маюць выключна важнае значэнне.

Значыць, іспыты трэба добра падрыхтаваць і правесці ўмела. Трэба, каб перад пачаткам іспытаў кожны настаўнік з выключнай яснасцю ўсвядоміў, як ён будзе праводзіць іспыты, па якіх прадметах яны будуць праходзіць, што і як спытаць у вучня. Тут таксама своеасаблівая тэхніка ў гэтых іспытах і тэхніка складаная, бо кожны настаўнік будзе мець справу з школьнікам, які глыбока перажывае як самыя іспыты, так і іх вынікі.

Таму іспыты ў школе ні ў якім выпадку нельга ператвараць у сухі, казённы, бюракратычны экзамен.

Адначасова нельга іспыты, самую тэхніку іспытаў пусціць на самацёк. Нельга дапусціць, каб кожны настаўнік, у часе іспытаў пытаў усё, што яму ўздумаецца, і праводзіў іспыты як захоча. Правільна врабіў Наркомасветы БССР, калі ў загадзе аб парадку правядзення іспытаў запісаў, што: «Настаўнік павінен скласці па падручніку паслядоўны і падрабязны пералік тэм і падтэм, пройдзеных на працягу навучальнага года, а таксама і рад сказаў для вуснага разбору, прыкладаў і задач для вусных іспытаў. Гэты пералік тэм і падтэм, прыкладаў і задач зацвярджаецца па кожнаму прадмету дырэктарам (загадчыкам) школы». Гэта датычыць і ўсяго распарадку правядзення іспытаў.

Адначасова з падрыхтоўкай і правядзеннем іспытаў трэба забяспечыць, каб школьнікі добра правялі і пазашкольны час. Трэба катэгарычна забараніць на час падрыхтоўкі і ў перыяд правядзення іспытаў праводзіць якія-б там ні было сходы і іншыя мерапрыемствы, якія перашкаджалі-б навучальнай рабоце. Злачынна ў перыяд іспытаў перагружаць дзяцей лішнімі сходамі і пасяджэннямі, злётамі і канферэнцыямі. Трэба, каб іспыты прайшлі ў выключна дзелавой абстаноўцы, без непатрэбнай шуміхі, без непатрэбнага дзёргання і школьніка і настаўніка.

Праверачныя іспыты ў школе — апошні этап навучальнага года. Пройдзен год вучобы, напружанай пліённай вучобы. Сканчэнне навучальнага года — вялікае свята для школьніка. І гэта сканчэнне трэба правесці як вялікае, радаснае свята.

Сканчэнне навучальнага года — свята ўсёй совецкай дзетвары, мімо якога не могуць прайсці ўсе нашы партыйныя, совецкія, профсаюзныя і ў першую чаргу комсамольскія арганізацыі. Трэба ўжо зараз рыхтавацца да гэтага свята з тым, каб яно прайшло сапраўды як радаснае, сонечнае свята вучобы, ведаў, вяселля і адпачынку.

Асобая роля ў гэтай справе належыць комсамолу. У іспытах, у сканчэнні навучальнага года, у летняй аздараўленчай кампаніі, комсамол будзе трымаць першы экзамен на перабудову тварам да школы, як патрабаваў Х-ты з'езд комсамола.

Умела, сур'ёзна правядзем праверачныя іспыты ў школе, дапаможам школьнікам радасна правесці свята сканчэння навучальнага года, забяспечым школьнікаў такой увагай, такімі клопатамі, якімі акружае іх партыя, якія праяўляе да іх таварыш Сталін.

Зніжэнне цэн на гаспадарчае і туалетнае мыла

Пастановай Соўнаркома Саюза ССР ад 15 мая гг. зніжаны цэны на гаспадарчае мыла ў сярэднім на 11 проц. і на туалетнае мыла на 15 проц.

На туалетнае мыла вышэйшага гатунку 78 проц. тлустасці ўстаноўлены рознічныя цэны для ўсяго Саюза ў размеры ад 1 рубля 35 кап. да 2 руб. 10 кап. за кавалак вагой у 100 грам, замест існаваўшай да 15 мая гг. цаны ад 1 рубля 60 кап. да 2 р. 35 кап.; на мыла першага гатунку 70 проц. тлустасці — ад 90 кап. да 1 р. 30 кап., замест існаваўшай цаны ад 1 р. 20 кап. да 1 р. 70 кап. Кавалак туалетнага мыла другога гатунку прадаецца за 70 кап. замест 80 кап.

БУЛЬБАЎБОРАЧНЫЯ МАШЫНЫ КАНСТРУКЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ДАСЛЕДЧАЙ СТАНЦЫІ

РАЗАНЬ, 16 мая. (БЕЛТА). Разанскі завод сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва выпусціў 5 двухрадных бульбаўборачных машын канструкцыі беларускай даследчай сельскагаспадарчай станцыі. У маі завод выпусціць 500 такіх машын. Машына ў дзень убірае 4 гектары.

ЦЭНТРАЛЬНЫ МУЗЕЙ В. І. ЛЕНІНА АДКРЫТ



Цэнтральны музей В. І. Леніна ў Маскве створан па ініцыятыве і пад непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Сталіна. У ім згуртаваны велізарныя гістарычныя каштоўнасці — сапраўдныя дакументы геніяльнай мыслі Леніна, барацьбы нашай партыі за ўстанаўленне дыктатуры пролетарыята, за справу міжнароднай рэволюцыі. Усе дакументы музея размешчаны ўмела і ярка малююць жыццё і дзейнасць Леніна. Музей Леніна выключна яркімі штрыхамі паказвае, як цесна быў звязан Ленін у сваёй рабоце з таварышам Сталіным, як гэтыя два гіганты пролетарскай мыслі і волі дапаўнялі адзін другога ў важнейшыя перыяды гісторыі нашай партыі і рэволюцыйнай барацьбы.

НА ЗДЫМКУ: Цэнтральны музей В. І. Леніна на плошчы Рэволюцыі ў Маскве. —

Фото Каралёва (Саюзфото).

РАЗГАРНУЦЬ ПРАПОЛКУ, УЗДЫМ ПАПАРАЎ І ЦАЛІНЫ

ПЕРШЫЯ ДНІ ПРАПОЛКІ ЗЕРНАВЫХ І ІЛЬНУ

ДУБРОЎНА, 15 мая. (Па тэлефону). Многія калгасы раёна прыступілі да першай праполкі ільну. У калгасах Бельскага сельсовета на 14 мая праполата 56,5 гектараў ільну і 114 гектараў азімых. Калгас «Чырвоны араты» прапалоў 18 гектараў і «Чырвоны ўдарнік»—16.

Разгортваецца праполка ільну ў калгасах Сініцкага сельсовета. Калгас «Аснова» скончыў першую праполку азімых і прапалоў першыя 5 гектараў ільну, «Чырвонае Чубакова» — 3 гектары ільну.

Калгасы змагаюцца за сканчэнне першай праполкі ільну да раённага злёту звенняўых, які адбудзецца 19 мая.

БАРАШКАЎ.

***

ПОЛАЦК, 16 мая. (Па тэлефону). Першым прыступіў да праполкі калгас імя Сталіна, Полацкага раёна. За некалькі дзён праполата 30 гектараў азімых. У калгасе арганізаваны звенні, за якімі замацаваны ўчасткі азімых і яравых пасеваў. У першыя дні звенні працуюць на аснове індывідуальнай здзельшчыны.

У Ветрынскім раёне да праполкі прыступіў калгас «Чырвоная Полаччына». За адзін дзень праполата 7,5 гектараў пшаніцы.

«Большэвік Полаччыны».

***

ОРША. Рана пасеяны лён у калгасе імя Куйбышэва дружна ўзышоў. На кожным сцябле з'явілася па 4—6 лісткоў. Лён дасягнуў пяці і больш сантыметраў росту.

Поўнасцю ўзышоў лён на плошчы ў 41 гектар у калгасе «Брыгадзір». Пад кіраўніцтвам ордэнаносца т. Палітыка у калгасе арганізавана падкормка ільну курыным памётам. Работа па падкормцы ільну праводзіцца пад наглядам спецыялістаў.

Падкармліваюць лён попелам у калгасе «Чырвоныя Ўсходы».

НА КАЛГАСНЫХ ПАЛЯХ КІЕЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КІЕЎ, 15 мая. (Па тэлеграфу). На 10 мая па Кіеўскай вобласці засеяна 77,5 процантаў усіх яравых. Паднята папараў 60,3 процантаў. Першая культывацыя папараў праведзена на 38,2 процантаў.

Праполата ільну 57,5 проц., азімых — 9,9 проц., яравых 1,6 проц. План пасадкі бульбы выканан на 95,8 проц.

Выпрацоўка на трактар па вобласці на 30 красавіка складае 138,8 гектараў, на «ЧТЗ» — 310 гектараў.

«Пролетарская правда».

З'ЯВІЛІСЯ ШКОДНІКІ ІЛЬНУ

Цёплая сонечная пагода спрыяе развіццю шкоднікаў палёў. На ільняных пасевах ужо з'явілася ільняная блыха. Па сігналах з месц ільняной блыхой заражана каля 3.000 гектараў пасеваў ільну.

Шкоднік з'явіўся на палях Менскага, Бабруйскага, Старадарожскага, Заслаўскага, Мсціслаўскага, Магілеўскага, Камарынскага і Чэрыкаўскага раёнаў. У Заслаўскім раёне заражана 150 гектараў, у Магілеўскім — 150, Камарынскім — 100 гектараў і т. д. Ільняная блыха выядае семядолі, якія маюць усе спажыўныя матэрыі для росту расліны, і ўсходы, пашкоджаныя ёю, гінуць.

Калгасы «Перамога» і «Прамень комуны», Старадарожскага раёна, своечасова знішчылі гэтага шкодніка ільняных пасеваў.

У радзе-ж астатніх раёнаў да барацьбы з ільняной блыхой амаль не прыступілі. У Магілеўскім раёне, дзе заражана 150 гектараў ільну, ёсць атруты для барацьбы з ільняной блыхой толькі на плошчу ў 60 гектараў.

Барацьбу са шкоднікамі пасеваў трэба неадкладна арганізаваць ва ўсіх раёнах, дзе яны толькі з'явіліся.

ТРАКТАРЫ І КОНЕЙ — НА ВОРЫВА ПАПАРАЎ

Лепельская першая МТС выканала план веснавых работ на 170 процантаў. Другі дзень як трактары пераключаны на ворыва папараў. Ужо ўзарана больш 200 гектараў.

Лепшы трактарыст Шэцяронак за чатыры дні ўзараў 46 гектараў папараў. З першых дзён нормы па ворыву перавыконваюцца. Трактарыст Стальмашонак за час веснавых работ узараў на сваім трактары 310 гектараў, Ганчар — 300 гектараў, Аўхунаў—240 гектараў.

Многія калгасы іншых раёнаў Лепельскай акругі таксама прыступілі да палняшня папараў.

У калгасах Сарачынскага сельсовета, Ушацкага раёна, усе калгасы прыступілі да праполкі ільну. У калгасе «Новы шлях» праполата 15 гектараў.

Нормы значна перавыконваюцца. Калгасніцы Ліпа Прося, Ханёнак Ульяна, Жавядова замест 0,15 гектара праполваюць за дзень па 0,30—0,35 гектара.

Праполка ільну пачынаецца ў калгасах Лепельскага раёна.

***

НАРОЎЛЯ, 16 мая. Рад калгасаў раёна пачалі ворыва папараў і асваенне новых зямель. Калгас «Пераможац» раскарчаваў 18-гектараў і скончыў ворыва папараў на плошчы ў 45 гектараў.

Калгас «Комунар» узараў 80 гектараў папару. У гэтым калгасе ёсць вялікі масіў неасвоенай зямлі, якая, па словах старых калгаснікаў, ляжыць няворанай ужо 40 гадоў.

На гэты масіў зараз вышлі трактары МТС. Трактарыст Зязетка Васіль узараў за два дні 18,25 гект. цаліны і зэканоміў 440 кілограмаў гаручага. Трактарыст Струк, які працуе на трактары разам з Зязеткам, узараў 15,5 гектараў і зэканоміў 350 кілограмаў гаручага.

НА ВОПЫТНЫХ УЧАСТКАХ КАЛГАСА „ПРАЦА“

Калгаснікі сельгасарцелі «Праца», Ельскага раёна, абавязаліся змагацца ў гэтым годзе за сапраўды рэкордны ўраджай — 30 цэнтнераў з гектара ячменю, 25 цэнтнераў пшаніцы і аўса, 33 цэнтнеры проса, 240 цэнтнераў бульбы, і 7 цэнтнераў ільновалакна.

Спаборнічаючы з суседнім калгасам «Прагрэс», калгаснікі ў час веснавой сяўбы даказалі работай на полі, што свае абавязацельствы яны выканаюць з гонарам. Раннія зерневыя ў арцелі былі пасеяны за 10 дзён (да 25 красавіка). На кожны гектар ячменю ўнесена 80 вазоў гною і 7 цэнтнераў фасфарытнай мукі. На кожны гектар аўса — 50 вазоў гною і 7 цэнтн. фасфарытнай мукі. На кожны гектар пшаніцы — 70 вазоў гною і 8 цэнтн. фасфарытнай мукі. Апрача таго, са з'яўленнем усходаў пад усе гэтыя культуры ўнесена дадаткова на кожны гектар па аднаму цэнтнеру калійнай солі.

Бульбу калгас пасадзіў выключна па зяблеву. Ранняй вясной зяблеў было прадыскавана і прабаранавана. Кожны гектар бульбы атрымаў 70 вазоў гною і 7 цэнтн. калійнай солі. Пасадка бульбы ў калгасе скончылася 10 мая.

Тав. САВІЧ—адзін з арганізатараў калгаса «Маяк социялізма», Барысаўскага раёна, брыгадзір. НА ЗДЫМКУ: т. Савіч у парніках калгаса правярае становішча капусты.

Лён пасеяў калгас на канюшынішчы, узараным на зіму. На кожны гектар пад лён унесена па 1,5 цэнтн. калійнай солі, глеба апрацавана вельмі добра.

З'явіліся дружныя ўсходы ільну, якія радуюць усіх калгаснікаў. Пачалі першую праполку.

У выглядзе вопыту брыгадзіры першай брыгады т. Клемлюк, Герасім і другой — Дзем'янаў Іван заклалі вопытныя гектары бульбы, аўса, ячменю і пшаніцы. На гэтых гектарах яны мяркуюць атрымаць 500 цэнтнераў бульбы, 32 цэнтнеры аўса і ячменю і 28 цэнтнераў пшаніцы.

Уся работа на вопытных гектарах калгаса праводзіцца пад кіраўніцтвам старшага агранома райземаддзела Паўлава, які абавязаўся разам з калгаснікамі змагацца за права пасылкі экспанатаў высокага сталінскага ўраджаю на ўсесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку

Р. ФРАЛОЎ.

У ЦК КП(б)Б

Бюро ЦК КП(б)Б вынесла пастанову аб ходзе выканання рашэння СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 16 студзеня 1936 года аб навучанні непісьменных і малапісьменных.

У гэтым рашэнні ЦК КП(б)Б адзначае, што гарадскія і раённыя партыйныя арганізацыі БССР да гэтага часу не ўзялі ў свае рукі кіраўніцтва работай па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці. Наркомасветы, профсаюзы і комсамол не прымаюць ніякіх мер да асобных сваіх звенняў і арганізацый, якія ігнаруюць гэта рашэнне СНК СССР і ЦК ВКП(б).

Існаванне вялікай сеткі школ непісьменных і малапісьменных у раёнах, у той час, калі ў пераважнай большасці гэтыя школы фактычна не працуюць, з'яўляецца ненармальным. Гэтыя школы не забяспечваюць выкананне важнейшых дырэктыў партыі і ўрада.

ЦК КП(б)Б катэгарычна папярэдзіў сакратароў акругкомаў, гаркомаў і райкомаў КП(б)Б аб тым, што яны асабіста нясуць адказнасць перад ЦК за поўнае выкананне кантрольных лічб па навучанню непісьменных і малапісьменных у 1936 годзе.

Акругкомам, гаркомам і райкомам партыі прапанавана распрацаваць канкрэтны план работы па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, а таксама асобна сетку школ па навучанню непісьменных і асобна сетку школ па навучанню малапісьменных на кожнаму прадпрыемству, калгасу і сельсавету. Неабходна дабіцца, каб на пачатку 1936 і 1937 гадоў была поўнасцю ліквідавана непісьменнасць і малапісьменнасць сярод усяго дарослага насельніцтва (да 50 год) па рэспубліцы.

У сувязі з тым, што ліквідацыя непісьменнасці сярод падрыстаў ва ўзросце ад 14 да 18 год павінна праводзіцца ў межах курсу нармальнай пачатковай школы, ЦК даручыў акругкомам, гаркомам і райкомам неадкладна правесці ўлік непісьменных падрыстаў і арганізаваць школу па іх навучанню.

На работу па ліквідацыі непісьменнасці ЦК даручыў акругкомам, гаркомам і райкомам мабілізаваць партыйны і комсамольскі актыў, накласць яго на прадпрыемствы, у калгасы, сельсаветы, дзе ён павінен практычна дапамагчы ў паляпшэнні работы школ. Да гэтай справы трэба прыцягнуць і беспартыйную сельскую інтэлігенцыю. Наркомасветы прапанавана перабудаваць работу кіраўніцтва па навучанню дарослых.

ЦК адзначыў, што ранейшая дырэктыва ЦК КП(б)Б аб стварэнні пры райвыканкомах, гарадскіх і сельскіх саветах секцыі па навучанню непісьменных і малапісьменных многімі саветамі не выканана. Партгрупе ЦВК БССР даручана прыняць неабходныя меры па забеспячэнню стварэння ўказаных секцый. Белдзяржвыдавецтва (дырэктар Шастакоў) не выканала ў тэрмін рашэнне ЦК аб выданні падручнікаў для школ непісьменных і малапісьменных. ЦК папярэдзіў тав. Шастакова, што ён будзе прыцягнут да суровай адказнасці, калі зараз-жа не будзе наладжан своечасовы і добраякасны выпуск падручнікаў.

Асобна ЦК КП(б)Б адзначыў, што профсаюзы Беларусі не толькі недаацанілі ўсёй важнасці справы навучання непісьменных і малапісьменных, але сваёй бяздзейнасцю патуралі сабатажу ў выкананні рашэння ЦК КП(б)Б па гэтаму пытанню. ПСПСБ, пад персанальную адказнасць тав. Кавальчука, прапанавана распрацаваць практычныя мерапрыемствы па разгортванню навучання непісьменных і малапісьменных. Гэтае-ж пытанне прапанавана абмеркаваць на бліжэйшым пасяджэнні бюро ЦК комсамола, з тым, каб комсамол Беларусі нарэшце ўключыўся ў работу па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, звярнуўшы асаблівую ўвагу на навучанне падростка ў.

ЦК абавязаў акругкомы, гаркомы і райкомы арганізаваць сістэматычнае штодзённае кіраўніцтва работай школ непісьменных і малапісьменных. Неабходна забяспечыць так іх работу, каб не было ні аднаго непісьменнага, не ахопленага школай, не было адсеву з школы, каб школа займалася нармальна ва ўстаноўлены для яе рашэннем ЦК ВКП(б) тэрмін, каб скончыўшыя школы выйшлі з яе сапраўды ўсвоўшы праграму. Заняткі па навучанню непісьменных і малапісьменных не павінны насіць сезонны характар, і таму ў летні перыяд гэтыя школы павінны працаваць нармальна.

Пасля праходжання ўсяго курсу ў школе неабходна стварыць спецыяльныя аўтарытэтныя камісіі па выпуску, прыцягваючы да гэтай справы прадстаўнікоў грамадскасці. Лепшых настаўнікаў і тых, хто добра скончыць курс школы, трэба прэміраваць.

Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) павінна быць выканана поўнасцю. За гэту справу адказваюць усе партыйныя, профсаюзныя, комсамольскія і совецкія органы.

НОТА СССР АНГЛІІ

ЛОНДАН, 15 мая. (БЕЛТА). Агенцтва Рэйтэр паведамляе: «паўпрад СССР Майскі ўручыў англійскаму міністэрству замежных спраў ноту, у якой паведамляецца, што СССР згодзен пачаць перагаворы з мэтай далучэння к нядаўна заключанаму лонданскаму морскаму дагавору. Згодна вестак агенцтва Рэйтэр, спадзяюцца, што перагаворы пачнуцца ў бліжэйшыя дні ў Лондане і што хутка знойдзена будзе аснова для пагаднення».

НОВЫ ПОЛЬСКІ УРАД

ВАРШАВА, 16 мая. (БЕЛТА). Учора прэзідэнт Польшчы Масціцкі зацвердзіў прапанаваны генералам Славой-Складкоўскім склад новага польскага габінета міністраў.

Прэм'ер і міністр унутраных спраў генерал Славой-Складкоўскі, віцэ-прэм'ер і міністр фінансаў Квяткоўскі; міністр замежных спраў Бек; ваенны міністр генерал Каспшыцкі і інш.

Міністры Квяткоўскі, Бек, Каспшыцкі, Свентаслаўскі, Панятоўскі, Ульрых і Калінскі займаюць тыя-ж пасты што і ў папярэднім габінеце Касцялкоўскага.

***

ВАРШАВА, 16 мая. (БЕЛТА). У варшаўскіх палітычных колах новы габінет Славой-Складкоўскага расцэньваюць, як спробу стварэння ўрада «моцнай рукі». Згодна аднадушнай ацэнкі ўсяго польскага друку, сфармаванне новага габінета на чале з Славой-Складкоўскім было прадыктавана меркаваннямі ўнутранай палітыкі ў сувязі з вельмі напружанай абстаноўкай у краіне.

Гутарка Ідэна з Блюмам

ЛОНДАН, 16 мая. (БЕЛТАЎ. Учарайшая гутарка англійскага міністра замежных спраў Ідэна з кіраўніком французскай социялістычнай партыі Блюмам у Парыжы (пры звароце Ідэна з Жэневы) выклікала вялікую цікавасць у палітычных колах. Газеты адзначаюць супадзенне пунктаў гледжання абодвух дзяржаўных дзеячоў.

Паводле слоў газеты «Таймс», у англійскіх колах стварылася ўражанне, што ёсць магчымасць вывесці еўрапейскую палітыку з тупіка, які стварыўся ў рэзультаце захвату Абісініі Італіяй.

Згодна паведамлення друку, Ідэн і Блюм прышлі да пагаднення, што было б мэтазгодна выпрацаваць агульную англа-французскую праграму дзеянняў у дачыненні Італіі перад наступным пасяджэннем Совета Лігі нацый.

Далейшая акупацыя Паўночнага Кітая

НЬЮ-ІОРК, 15 мая. (БЕЛТА). Агенцтва «Асашыэйтэд прэс» перадае, што ў Цяньцзінь прыбылі новыя часці японскіх войск колькасцю ў 7.600 чалавек. Частка японскіх войск будзе неадкладна накіравана з Цяньцзіня ў Бейпін. Агенцтва паведамляе:

«Японія паведаміла дыпламатычныя прадстаўніцтвы ў Бейпіне адносна значнага павелічэння японскіх войск толькі ўчора, інакш кажучы, паставіла гэтыя дыпламатычныя прадстаўніцтвы перад адбыўшымся фактам».

Паводле слоў агенцтва «ўзмацненне японскіх войск у Паўночным Кітаі ставіць мэтай поўную акупацыю Паўночнага Кітая».

Партызанская вайна ў Манчжурыі

ШАНХАЙ, 15 мая. (БЕЛТА). Газеты паведамляюць, што партызанскі атрад у Манчжурыі пад камандай кітаянкі Лі Хун гуань у канцы красавіка зрабіў паспяховы рэйд на горад Гучэн (на рацэ Суйфынь). Гарнізон войск Манчжоу-Го колькасцю ў 1.000 чалавек, захвачаных знянацку, здаўся без супраціўлення. У тую-ж ноч, падвёўшы захвачаныя гарматы к берагу, атрад абстраляў дзве манчжурскія кананеркі і адступіў толькі пасля расходвання ўсіх снарадаў.

***

ШАНХАЙ, 14 мая. (БЕЛТА). Чанчуньскі карэспандэнт агенцтва Хуалянь паведамляе, што партызанскі атрад у 600 чалавек пасля хова атакаваў войскі Манчжоу-Го ў павеце Тан Юань (правінцыя Саньцзянь). У часе атакі забіты тры японскія афіцэры.

Агітацыя і прапаганда

Расонскі райком зрывае партвучобу

Расонскі райком партыі не раз займаўся пытаннем партыйнай вучобы. Нават умудрыліся на працягу года некалькі раз мяняць структуру партыйных школ і гурткоў. Аднак, партвучоба ў раёне праходзіць яўна нездавальняюча. Зусім дрэнна праведзена камплектаванне.

Пры первічнай арганізацыі Расонскай МТС арганізавалі гурток па вывучэнню гісторыі партыі. У гэтым гуртку разам з усімі вывучаюць гісторыю партыі па падручніку Яраслаўскага комуністы Астапенка і Гулакоў, якія толькі ў 1936 г. скончылі Вышэйшую комуністычную сельскагаспадарчую школу Беларусі імя Леніна.

Па такому прынцыпу ўкамплектавана партыйная школа і пры райкоме партыі. У адну групу гэтай школы залічылі 36 чалавек з райпартактыва (амаль палова ўсёй партарганізацыі) з розным узроўнем ведаў.

Яшчэ ў мінулым годзе ЦК ВКП(б) у пастанове «Аб прапагандысцкай рабоце ў бліжэйшы час» лічыў: «недапушчальнай тэндэнцыю асобных партыйных арганізацый згарнуць на лета прапагандысцкую работу», бо: «палітыка-выхаваўчая работа партыі не можа насіць «сезонны» характар, а павінна весціся сістэматычна на працягу ўсяго года».

Аднак, кіраўнікі расонскай партарганізацыі не зразумелі ўсёй важнасці гэтай пастановы. У сувязі з веснавой сяўбой райком партыі дапусціў згортванне партыйнай вучобы.

З 13 красавіка перастала існаваць партыйная школа пры райкоме партыі, у якой навучаецца палова комуністаў усёй арганізацыі. Перасталі вучыцца і комуністы з первічных арганізацый Крупкоўскага і Гарбачоўскага сельсоветаў.

Між тым, комуністы жадаюць вучыцца, жадаюць вывучаць слаўныя традыцыі большэвізма. Але райком партыі ім у гэтым не дапамагае.

Аказваецца, што такую дыскрэдытыву аб спыненні ўсякіх партыйных заняткаў у часе веснавой сяўбы даў райкому партыі загадчык полацкага акруговага земельнага аддзела т. Грышанаў. Расонскі РК КП(б)Б і яго сакратар т. Чумакоў прынялі да няўхільнага кіраўніцтва ўстаноўку Грышанава, якая ў корані разыходзіцца з рашэннем ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б.

***

Зусім слаба пастаўлена агітацыйна-масавая работа ў калгасах раёна.

У Расонскім раёне нямала калгаснікаў, якія паказваюць большэвіцкія ўзоры барацьбы за высокаякаснае правядзенне сяўбы, узоры барацьбы за высокі ўраджай. Тт. Марозаў Павел, Крыленка Рыгор, Лосеў Сцяпан і іншыя, на ворыве аднаконным плугам пры зменных конях узоравалі ад 1,86 да 2,56 гектара за дзень. Нямала ў раёне калгаснікоў-тысячнікаў барацьбітоў за тысячу кілограмаў ільновалакна з гектара. Але іх прыклады работы не становяцца здабыткам усіх калгаснікаў.

Райком партыі займаўся пытаннямі палітмасавай работы ў час сяўбы. Аднак, не навучыліся яшчэ ў Расонах правяраць свае ўласныя пастановы. І пастановы РК КП(б)Б у большасці застаюцца пакуль што пустымі паперкамі. А гэта адбіваецца на ўсёй рабоце партыйнай арганізацыі, на дапамозе первічным арганізацыям у наладжанні партмасавай работы і арганізацыі калгаснага актыва. Зусім не дзіўна, што Расонскі раён з'яўляецца адным з адстаючых раёнаў Полацкай акругі.

Б. РОБЕРМАН.

ЗАБАРАНІЛІ КОМУНІСТАМ ВУЧЫЦЦА

Праверка і абмен партыйных дакументаў у Чэрвеньскім раёне ўзнялі зацікаўленасць кожнага члена і кандыдата партыі да вывучэння тэорыі марксізма-ленінізма, вывучэння слаўнай гісторыі нашай партыі.

Аднак, у некаторых первічных арганізацыях яшчэ наглядаюцца несур'ёзныя адносіны да партыйнай вучобы.

У первічнай арганізацыі Калодзіцкага сельсовета парторг **Капілевіч** забараніў прапагандысту праводзіць партзаняткі ў сувязі з падрыхтоўкай да свята Першага мая.

Парторг первічнай арганізацыі Хутарскога сельсовета **Шышанок** зусім распусціў партшколу на ўвесь час сяўбы. Такія-ж факты наглядаюцца і ў первічных партарганізацыях завода «Ўдарнік» і інш.

А ў партшколах, у якіх заняткі працягваюцца, за апошні час наглядаюцца факты, калі асобныя комуністы перасталі рыхтавацца і нават зусім не лічаць патрэбным з'яўляцца на заняткі, як тав. **Эпштэйн** (Дзяржбанк), **Ліўшыц** (пошта) і інш.

Перастаў працаваць і семінар прапагандыстаў. Усё гэта з'яўляецца рэзультатам таго, што райком партыі не правярае выканання сваіх уласных пастаноў аб партыйнай вучобе.

А. АСТАПЕНКА.

У ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

ОРДЭНАНОСЕЦ ТАВ. СТАСКЕВІЧ ПРЫНЯТ У ГРУПУ СПАЧУВАЮЧЫХ

Ордэнаносец **Стаскевіч** Васіль (делегат усесаюзнай нарады перадавікоў жывёлагадоўлі) загадчык СТФ калгаса «Комунар», Велікараеўскага сельсовета, Капыльскага раёна, падаў заяву аб прыёме яго ў групу спачуваючых КП(б)Б.

Агульны сход велікараеўскай первічнай арганізацыі прыняў т. Стаскевіча ў групу спачуваючых КП(б)Б.

М. САДОЎСКІ.

АГУЛЬНАГАРАДСКАЯ НАРАДА СПАЧУВАЮЧЫХ

Рэчыцкі райком партыі пядаўна правёў агульнагарадскую нараду спачуваючых разам з сакратарамі парткомаў і партарганізатарамі.

На нарадзе заслуханы справаздачы сакратароў парткомаў фінернага завода тав. Тычкова, «Х Кастрычнік» тав. Фінкельберга і рад іншых сакратароў парткомаў і партарганізатараў, па пытанню як яны працуюць са спачуваючымі.

На гэтай нарадзе намецілі канкрэтны план работы як па ўздыму культурна-палітычнага ўзроўню спачуваючых, так і па ўцягненню іх у практычную работу.

ПЕРШАЯ ХАТА-РАДЗІЛЬНЯ

За год існавання першай хаты-радзільні ў БССР (Грычанскі сельсавет Менскага раёна), у ёй нарадзілася 135 дзяцей. Ні аднаго выпадку смяротнасці не было. Радзільны дом мае шырокую папулярнасць у раёне. НА ЗДЫМКУ: калгасніца Марыля Аляксандраўна Клімовіч пакідае радзільны дом.

Фото С. ГРЫНА (Белсаюзфото).

ЗА АКТЫЎНУЮ ГРАМАДСКУЮ РАБОТУ

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»). Адзін з прасторных пакояў клуба металістаў заняўлі жонкі гаспадарнікаў, інжынераў і тэхнікаў завода імя Кірава, якія сабраліся для абгаварэння адозвы ўсесаюзнай нарады жонак гаспадарнікаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў цяжкай прамысловасці.

Актыўная грамадская работа жонак гаспадарнікаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў завода імя Кірава пачалася пару месяцаў таму назад. За гэты час таварышы паспелі прывесці ў парадак заводскую сталовую і праверыць жылёвыя ўмовы раду стахановцаў. Але гэта работа толькі ў зачатку і праходзіць яна не зусім арганізавана.

Да гэтага часу ў штодзённай грамадскай рабоце актыўны ўдзел прымаюць толькі 6 жонак інжынерна-тэхнічных работнікаў. Гэта тт. Геніна, Лебедзева, Кароўкіна, Рыгор, Лосеў Сцяпан і іншыя, на ворыве аднаконным плугам пры зменных конях узоравалі ад 1,86 да 2,56 гектара за дзень. Нямала ў раёне калгаснікі-тысячнікі барацьбітоў за тысячу кілограмаў ільновалакна з гектара. Але іх прыклады работы не становяцца здабыткам усіх калгаснікаў.

Райком партыі займаўся пытаннямі палітмасавай работы ў час сяўбы. Аднак, не навучыліся яшчэ ў Расонах правяраць свае ўласныя пастановы. І пастановы РК КП(б)Б у большасці застаюцца пакуль што пустымі паперкамі. А гэта адбіваецца на ўсёй рабоце партыйнай арганізацыі, на дапамозе первічным арганізацыям у наладжанні партмасавай работы і арганізацыі калгаснага актыва. Зусім не дзіўна, што Расонскі раён з'яўляецца адным з адстаючых раёнаў Полацкай акругі.

Б. РОБЕРМАН.

УСЕ ЦЭХІ ЎЗЯТЫ ПАД КУЛЬТУРНЫ НАГЛЯД

ОРША, 15 мая. Жонкі інжынерна-тэхнічных работнікаў і стахановцаў прадпрыемстваў і чыгункі Оршы на сваіх сходах прапрацоўваюць матэрыялы ўсесаюзнай нарады жонак гаспадарнікаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў цяжкай прамысловасці. Яны расказваюць аб сваёй рабоце, бяруць канкрэтныя абавязацельствы.

Вялікую работу правялі жонкі ІТР БелДРЭСа. Тут арганізаваны жаночыя секцыі, брыгады і пасты. Усе цэхі, інтэрнаты, сталовая, дзіцячыя ўстановы, кожны магазін узяты пад культурны нагляд. Жонкі ІТР вучаць повароў, як лепш варыць абеды і ўрознастайніць меню. Ужо абследвана больш паловы кватэр рабочых і служачых. Па ініцыятыве совета была арганізавана экскурсія жонак ІТР і стахановцаў на электрастанцыю для азнаямлення з рабочым месцам і ўмовамі працы ў цэхах. Саветам жонак на БелДРЭСе кіруе жонка галоўнага інжынера Гарэнава—дэлегат усесаюзнай нарады.

На гэтым сходзе было намечана правесці наступныя мерапрыемствы: прывесці ў яшчэ больш культурны выгляд сталовую і заняцца паляпшэннем абедаў, прывесці ў культурнае становішча варштатабудаўнічы, сельскагаспадарчы і рамонтны цэхі, дапамагчы дзіцячаму саду і падшэфным школам у адборы дзяцей для пасылкі іх на дачы і арганізацыі культурнага летняга адпачынку для дзяцей, якія застаюцца ў горадзе. Пры клубе арганізаваць дзіцячую летнюю пляцоўку і інш. Усю гэту работу правесці за бліжэйшыя два тыдні.

— Нам, — заявілі таварышы, — партыя і ўрад стварылі шчаслівае і радаснае жыццё. Аб нас клапоціцца асабіста таварыш Сталін. У адказ на гэтыя клопаты мы яшчэ актыўней прымемся за непасрэдны ўдзел у социялістычным будаўніцтве з тым, каб ісці плячо ў плячо са сваімі мужамі.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

АДКАЗ СПРАВАЙ

На заводзе імя Молатава адбылася нарада жонак гаспадарнікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў. Прапрацавалі адозву ўсесаюзнай нарады.

Жонкі інжынерна-тэхнічных работнікаў завода пачалі актыўную грамадскую работу. Тт. **Бурдун, Карасік, Вайсман, Клепко** і іншыя пачалі праводзіць культурна-выхаваўчую работу ў інтэрнатах. Некаторыя жонкі ўзяліся за ліквідацыю малапісьменнасці сярод рабочых. На заводзе выбралі совет жонак, старшынёй якога з'яўляецца жонка начальніка цэха тав. **Малковіч.**

Жонкі інжынерна-тэхнічных работнікаў завода імя Молатава выклікалі на спаборніцтва на лепшую пастаноўку работы жонак гаспадарнікаў і ІТР бабруйскага лесакамбіната.

ФРЫД.

„ЗА МІР, ХЛЕБ І СВАБОДУ!"

АДОЗВА КАМІТЭТА НАРОДНАГА ФРОНТА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 15 мая. (БЕЛТА). Камітэт народнага фронта звярнуўся да народных мас Францыі з наступнай адозвай:

«Народны фронт атрымаў перамогу. У адказ на яго заклік масы паказалі мяцежнікам 6 лютага сваю агіду да ўсіх форм фашызма і заявілі аб сваёй нязменнай прыхільнасці да дэмакратычных свабод.

Упэўнены ў падтрыманні мас, урад заўтрашняга дня павінен без малейшага адкладу прыступіць да ажыццяўлення патрабаванняў народнага фронта, якія мільёны грамадзян замацавалі сваёй клятвай.

Выратаваць свабоду, пакласці рашучы канец прошукам мяцежных ліг, раззброіць і распусціць іх. Забяспечыць мір і міжнародную справядлівасць. Абараніць непадзельны мір з дапамогай пактаў аб узаемнай дапамозе ў рамках Лігі нацый, прапанаваць усяму свету ўсеагульнае, адначасовае і кантрахюемае скарачэнне ўзбраенняў, забяспечыць нацыяналізацыю ваеннай прамысловасці і знішчыць прыватны гандаль зброяй. Даць хлеб усім; у першую чаргу і безадкладна павесці барацьбу супроць беспрацоўя, неадкладна прыступіўшы да ажыццяўлення нацыянальнага плана вялікіх грамадскіх работ; адкрыць шлях да высоўвання моладзі: правесці 40-гадзінны рабочы тыдзень без скарачэння зарплаты, зрабіць абавязковымі працоўныя калектыўныя дагаворы; выправіць несправядлівасць, прычыненую надзвычайнымі дэкрэтамі; аднавіць матэрыяльныя правы былых удзельнікаў і афіцэраў; устанавіць справядлівыя цэны на сельскагаспадарчыя прадукты.

Для гэтага аздараўлення нацыі, для таго, каб цесна звязаць з гэтай справай працоўных горада і вёскі, для таго, каб знайсці неабходныя сродкі, новы ўрад павінен будзе смела і з жалезнай энергіяй абузданць спекулянтаў і дэзертыраў, якія падрываюць устойлівасць франка, пакласці канец тыранніі Банк дэ Франс і прымусіць алігархію падначаліцца волі народу.

Перад людзьмі, якім новы парламент уручыць лёс Францыі, адкрываецца велізарнае і трудное поле дзеяння. Але якую славу прынясе ім іх праца, калі жатва будзе адпавядаць велізарным надзеям краіны. Калі народны фронт рэкамендуе сваім прыхільнікам аказаць давер'е ўраду, то трэба, каб ён ведаў, што масы застануцца непахітнымі і не даруюць яму ніякай слабасці. Яны патрабуюць ад урада дзеянняў і яшчэ раз дзеянняў, энергіі і яшчэ раз энергіі, смеласці і яшчэ раз смеласці, звусёды смеласці».

АДСТАЎКА ПОЛЬСКАГА УРАДА

ВАРШАВА, 15 мая. (БЕЛТА). Толькі што выйшлі экстраныя выпускі газет, у якіх паведамляецца, што габінет Касцялкоўскага на пасяджэнні, якое адбылося сёння ўвечары, прыняў рашэнне падаць у адстаўку. Прэзідэнт Польшчы прыняў адстаўку і даручыў стварэнне новага габінета генералу Славой-Складкоўскаму, які на ўрадзе Касцялкоўскага займаў пост другога намесніка ваеннага міністра. Славой-Складкоўскі з 1926 па 1931 год амаль безупынна быў міністрам унутраных спраў.

У САБАЧЫХ КАНУРАХ

ЯК ЖЫВУЦЬ БЕСПРАЦОЎНЫЯ Ў ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 14 мая. (БЕЛТА). «Газета польска» спыняецца на беспрацоўі ў польскім порце Гдыні.

«У марах кожнага беспрацоўнага ў Польшчы — піша газета — Гдыня ўяўляецца месцам, дзе фізічна здаровы чалавек зараз-жа можа знайсці работу. На апошнія сабраныя грошы, атрыманыя ў якасці міластыні ці пазычаныя ў знаёмых, дзесяткі няшчасных едуць у Гдыню ў надзеі, што раптам ім усміхнецца лёс. Яны чулі аб размаху будаўніцтва першага польскага порта. Але перыяд будаўніцтва ўжо скончыўся, работы няма. У самы цяжкі зімні час, у студзені бягучага года, у Гдыні было 12 тыс. беспрацоўных. Дадаўшы да гэтай колькасці членаў сем'яў, атрымаем 33 тыс. чалавек у Гдыні, якія не маюць ніякага заработку. Мізэрная дапамога па беспрацоўю, якая была выдана гэтай зімой, склала ўсяго 8 злотых 20 грошаў на чалавека за ўсю зіму».

Газета апісвае ўмовы, у якіх жывуць беспрацоўныя:

«Раскіданыя сярод прыгожых лясістых гдыньскіх узгоркаў кануры і шалашы напамінаюць горшыя ваенныя часы ці часы стыхійных няшчасцяў. У бараках, дасех збітых з дошак, розных яшчыкаў, бляхі і яшчэ з нейкіх няпэўных будаўнічых матэрыялаў, гнездзяцца цэлыя сем'і беднякоў».

ПІСЬМО ПАЛІТБЮРО КОМПАРТЫІ ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 15 мая. (БЕЛТА). Газеты «Юманітэ» і «Папюлер» змяшчаюць сёння тэкст пісьма палітбюро компартыі Францыі, адпраўленага кіраўніцтву социялістычнай партыі ў адказ на запрашэнне прыняць удзел у будучым урадзе.

Усебакова вывучыўшы прапанову социялістычнай партыі, гаворыцца ў пісьме, палітбюро аднадушна рашыла, што ў інтарэсах агульнай справы, справы народнага антыфашысцкага фронта, няма неабходнасці змяняць палітыку, выпрацаваную нашым нядаўнім з'ездам. Далей палітбюро адзначае: **«Мы кіруемся выключнымі клопатамі: забяспечыць любой цаной поспех эканамічнага і социяльнага абнаўлення, абарону свабоды і праў, якіх жадае французскі народ».**

Палітбюро выказвае ўпэўненасць, што комуністы, не ўступаючы ва ўрад, лепш паслужаць справе народу, лаяльна падтрымліваючы ўрад, кіруемы социялістамі.

Новы абстрэл япона-манчжурамі совецкай пагранаховы

ХАБАРАЎСК, 14 мая. (БЕЛТА). Тут атрыманы весткі аб новым абстрэле япона-манчжурамі совецкай пагранічнай аховы. У 17 гадзін 30 мінут совецкі пагранічны нарад у складзе 5 чалавек, наглядаўшы за граніцай з вышыні, якая знаходзіцца на совецкай тэрыторыі, за 1.800 метраў на паўночны захад ад пагранзнака № 6 (18 клм. на захад ад Нова-Кіеўска), заўважыў, што да граніцы набліжаюцца тры групы ўзброеных японцаў агульнай колькасцю каля 25 чалавек. Убачыўшы совецкіх пагранічнікаў, японцы адкрылі з адлегласці ў 2 клм. ружэйны агонь, падыйшлі, не спыняючы яго, на 500 метраў да граніцы і залеглі там, прадаўжаючы абстрэл.

Жадаючы пазбегнуць абастрэння інцыдэнту, совецкія пагранічнікі адказнага агню не адкрывалі.

ГЕСТАПО НА ЛАВЕ ПАДСУДНЫХ

У Базелі (Швейцарыя) скончыўся працэс па справе агента германскага гестапо Веземана, які прымаў удзел у скрадзенні левага германскага журналіста, эмігранта Якоба. Як вядома, Якоб быў гвалтоўна ўвезен на германскую тэрыторыю. Працэс Веземана толькі часткова ўскрыў дзейнасць агентаў германскага фашызма за граніцай, якія не адмаўляюцца ні ад якіх злачынстваў у дасягненні сваёй мэты. НА ЗДЫМКУ: судовае пасяджэнне па справе Якоба. У цэнтры — стаіць — Якоб направа ад яго — Веземан.

Саюзфото.

ПАСЛЯ ПЕРАМОГІ НАРОДНАГА ФРОНТА ВА ФРАНЦЫІ

«Было-б бескарысна адмаўляць перамогу, атрыманую партыямі крайняй левай на абодвух турах выбараў і на выбарах у цэлым. Іх поспехі — ашаламляючыя. «Юманітэ», як і «Папюлер», у поўным праве ўслаўляць цяпер сваю перамогу. Комуністычная партыя атрымае ў будучай палаце 72 мандаты замест ранейшых 10; партыя социялістаў—146 замест 96. Гэта — трыумф абодвух інтэрнацыяналаў. Выбары характарызуюцца рэволюцыйным зрухам, і п. Марсель Кашэн паказвае толькі сваю празмерную скромнасць, калі ён заяўляе ў «Юманітэ», што ў перамозе народнага фронта комуністычная партыя проста рэгіструе «сваю долю поспеху». Гэта доля — львіная доля, і мы дадамо — зусім натуральна, што іменна так і здарылася».

У такіх напоўненых ледзь стрымліваемай ярасцю выразах характарызавала парыжская газета «Тан» вынікі другога туру парламенцкіх выбараў ва Францыі. Гаспадары газеты — славуты «Комітэ дэ Форж» (аб'яднанне цяжкай прамысловасці) разам з усімі сваімі прыяцелямі і аднадумцамі з радоў французскай рэакцыі і фашызма ледзь могуць прыйсці ў сябе ад разгрому на выбарах. Аднак, іменна гэта іх бяссільнае шаленства прымушае іх украпліваць у патокі пагроз і паклёпніцкіх выпадаў па адрасу партыі народнага фронта таксама і некаторую долю праўды.

У прыведзенай намі цытаце «Тан» наперакор сваёй волі канстатуе непраложную ісціну: «Львіная доля поспеху», галоўная заслуга ў атрыманай народным фронтам Францыі перамозе належыць слаўнай комуністычнай партыі.

На самой справе, уся гісторыя стварэння народнага фронта ва Францыі — гэта гісторыя ўпартай, мэтанакіраванай барацьбы французскіх комуністаў за ажыццяўленне гэтай ідэі. Народны фронт Францыі — гэта зусім не прадвыбарчы блок некалькіх партый, створаны для аспрэчвання парламенцкіх мандатаў у правых канкурэнтаў. Гэта — **магутны народны рух, які паставіў сваёй мэтай перагарадзіць дарогу фашызму, весці барацьбу за свабоду, за хлеб, за мір.**

Народны фронт Францыі нарадзіўся не ля выбарчай урны. Ён узнік яшчэ ў тых суровых лютаўскіх баях 1934 года, калі абнаглелы фашызм вышаў на вуліцу, каб разагнаць парламент, каб разграміць дэмакратычныя свабоды трэцяй рэспублікі і сагнуць у барану рог рабочы клас на прыкладу сваіх германскіх аднадумцаў.

Ужо тады комуністычная партыя Францыі зразумела, якая пагроза навісла над французскім пролетарыятам і працоўнымі. З большэвіцкай рашучасцю, з велізарным тактычным майстэрствам яна кінула ў масы лозунг антыфашысцкага народнага фронту. З велізарнай энергіяй і напорыстасцю яна неадкладна стала праводзіць гэты лозунг у жыццё. Гітлераўская антыфашысцкая контрдэманстрацыя 9 лютага 1934 года, бліскуча праведзеная ўсеагульная стачка па ўсёй Францыі 12 лютага — вось тыя першыя баявыя эпізоды, у якіх выкоўваўся антыфашысцкі народны фронт, у якіх адбывалася перш за ўсё аб'яднанне социялістычных і комуністычных рабочых у барацьбе супроць агульнага ворага.

Наўрад ці трэба напамінаць, што далучэнне да народнага фронта самай магутнай і шматлікай партыі французскай дробнай буржуазіі—партыі радыкалаў-социялістаў, далучэнне да яго шматлікіх арганізацый і аб'яднанняў пацыфісцкага, культурнага, навуковага і інш. характару стала магчымым толькі тады, калі быў пераможан раскол у прафесіянальным руху Францыі, калі комуністычная і социялістычная партыі ў значнай меры каардынавалі свае выступленні. Інакш гаворачы, як гэта і ўказана ў рашэннях VII сусветнага кангрэса Комінтэрна, **адзіны пролетарскі фронт з'явіўся тым стрыжнем, вакол якога згрупаваліся значна больш шырокія масы французскага народу.**

У часе выбарчай барацьбы і ў асаблівасці ў часе другога туру галасавання народны фронт правёў зусім выключную дысцыплінаванасць і арганізаванасць. Не трэба забываць, што на цяперашніх выбарах была высунута большая колькасць кандыдатаў, чым калі-б там ні было за час існавання трэцяй рэспублікі. Ужо адно гэта ўказвала на выключную напружанасць барацьбы. У першым туры галасавання, як вядома, было выбрана менш адной трэці неабходнага складу палаты. Пераважная большасць мандатаў аспрэчвалася іменна ў другім туры. Вось тут-то і сказалася ўся сіла арганізаванасці і згуртаванасці народнага фронту. Усюды, за зусім мізэрнымі выключэннямі, партыі народнага фронта, атрымаўшыя пры першым галасаванні адносна меншы лік бюлетэняў, знімалі свае кандыдатуры ў карысць кандыдатаў той з партый народнага фронта, якая атрымала найбольшы лік галасоў. Адначасова яны заклікалі сваіх выбаршчыкаў галасаваць за гэтага кандыдата, які, такім чынам, у другім туры з'яўляўся ўжо кандыдатам не асобнай левай партыі, а **народнага фронта ў цэлым.**

Парламенцкія выбары ва Францыі маюць значэнне, далёка выходзячае за межы гэтай краіны. Калі гітлераўскі фашызм прышоў да ўлады, ён заяўляў, што на прыкладзе Германіі паказана гістарычная тэндэнцыя неміучай фашызацыі ўсіх дзяржаў Заходняй Еўропы. Выбары ва Францыі паказалі, што ў Еўропе перамагае другая гістарычная тэндэнцыя. **На аснове адзінага пролетарскага фронта, на базе шырокага народнага фронта вырастае магутная сіла, здольная процістаяць фашызму і адстоўваць дэмакратычныя завяванні ў інтарэсах рабочага класа і ўсіх працоўных.** Уроки перамогі фашыстаў у Германіі, відаць, не прапалі даремна для працоўных мас другіх дзяржаў. У гэтым сэнсе французскія выбары маюць вельмі важнае міжнароднае значэнне.

Добра вядома, што французскі фашызм, наперакор свайму хвалёраму «патрыятызму», гатоў зрабіць вялікі французскі народ зброяй палітыкі гітлераўскага авантурызма. Добра вядома, што кіраўнікі гэтых своеасаблівых «патрыётаў» не раз ужо адпраўляліся на паклон у Берлін і знаходзяцца ў пастаянным і цесным кантакце з фашыстамі Германіі. У часе прадвыбарчай кампаніі глава найбольш буйнай фашысцкай лігі «баявых крыжоў», славуты палкоўнік дэ ля Рок выпусціў маніфест, у якім між іншым указваў на неабходнасць выхаду Францыі з Лігі нацый.

Лёгка сабе ўявіць, які ўплыў на міжнародную абстаноўку аказала-б перамога гэтых паноў ва Францыі. Францыя дэ ля Рокаў несуменна апынулася-б ва ўладзе гітлераўскай Германіі і вельмі хутка была-б звезена на становішча другараднай дзяржавы.

Французская компартыя ішла на выбары, як верны посьбіт вялікіх рэволюцыйных традыцый французскага народу. Разам з компартыяй народны фронт у цэлым начартаў на сваіх сцягах вялікае слова «Мір». Народны фронт з'яўляецца пераконаным прыхільнікам эфектыўных дзеянняў Лігі нацый і сістэмы калектыўнай бяспекі. Вось чаму перамогу народнага фронта і па-за Францыяй павінны вітаць усе сапраўдныя прыхільнікі міру і бяспекі народаў.

Але няправільна было-б думаць, што бліскучы выбарчы поспех народнага фронта з'яўляецца скончэннем барацьбы працоўных мас Францыі супроць рэакцыі і фашызма. Хутчэй гэты поспех трэба прызнаць **пачаткам** яшчэ больш жорсткай барацьбы. Французскі фашызм, французская рэакцыя, зразумела, яшчэ далёка не склалі зброі. Яны ўжо пераходзяць да адкрытых пагроз і нават дзеянняў у тых формах, якія для іх даступны.

«Лозунгі пераможцаў — пісаў гэтымі днямі адзін з рэакцыйных французскіх публіцыстаў,— аказуцца бяссільнымі перад тварам неабходнасці. Народны фронт мае толькі разуменне сваіх тзорый і магчымасць руйнаваць. Немагчыма, каб клопаты аб будучым Францыі былі ўскладзены на народны фронт».

Тое, што адбываецца ў апошнія дні на парыжскай біржы, з'яўляецца прамым ажыццяўленнем праваканцыйных дырэктыў цытаванага намі фашысцкага публіцыста. Спекуляцыйная ігра, накіраваная да падзення франка, забранне каштоўнасцей з банкаў, кантрабандная ўцечка золата за граніцу — вось тыя меры, якімі французская рэакцыя ў першую чаргу хоча пазбавіць народны фронт «магчымасці дзейнічаць». Французская рэакцыя ўжо не раз за гісторыю трэцяй рэспублікі ўжывала гэтыя подлыя фінансавыя трукі, калі яна хацела скінуць той ці іншы ўрад. Францыя — краіна дробных зберагальнікаў. Крушэнне франка, арганізуемае буржавымі спекулянтамі і банкаўскімі заправіламі, лёгка можа прысвесці да панікі сярод шырокіх слаёў французскага народу. Лёгка зразумець, што цяпер, калі склад новага парламента і звязаны з вынікамі выбараў склад новага ўрада будзе асабліва ненавісны рэакцыянерам, магнаты фінансавага капітала з асаблівай капь у ход гэту сваю атручаную зброю. Канчатковая перамога народнага фронта будзе магчыма толькі тады, калі гэта зброя наўсёды будзе вырвана з рук французскіх рэакцыянераў.

Які-ж будзе ўрад, які прыдзе да ўлады ў рэзультаце выбараў? Французская компартыя зусім ясна і дакладна акрэсліла сваю пазіцыю. У неаднаразовых заявах, да і пасля выбараў яе правадыры ўказвалі, што яны акажуць максімальнае парламенцкае і па-за-парламенцкае падтрыманне таму ўраду, які будзе ажыццяўляць праграму народнага фронта. Але ад уваходжання ў новы ўрад французская компартыя пакуль устрымліваецца. Яна лічыць, што ўрад народнага фронта з удзелам комуністаў ствараецца не ў рэзультаце адных толькі выбарчых перамог, а толькі пры пэўнай агульнай палітычнай абстаноўцы, у пэўны гістарычны момант. Гэты момант ва Францыі яшчэ не наступіў і такой палітычнай абстаноўкі пакуль няма.

З другога боку, социялісты зусім выразна заявілі, што яны згодны стварыць урад нават у тым выпадку, калі ў яго адмовяцца ўвайсці комуністы і радыкалы-социялісты. Маркуючы па таму, як развіваюцца ва Францыі папярэднія перагаворы аб сфармаванні ўрада будзе складацца або цалкам з социялістаў, або з социялістаў і з удзелам радыкал-социялістаў. Сумесны візіт Леона Блюма і лідэра радыкалаў Далад'е да прэмяра Сарро, як быццам, пацвярджае магчымасць ажыццяўлення гэтага другога варыянту.

Ва ўсякім выпадку перад партыямі народнага фронта, пасля іх бліскучай надзвычай цяжкія і складаныя задачы. Калі новы ўрад будзе цвёрда і стойка праводзіць у жыццё праграму народнага фронта, калі ён зможа дзейнічаць з усёй неабходнай энергіяй і рашучасцю, то няма сумнення, што народны фронт у сваёй практычнай дзейнасці ў якасці кіраўніка французскай рэспублікі атрымае такія-ж бліскучыя перамогі, якія ён атрымаў на выбарах.

Ф. ШПІГЕЛЬ.

ПАГРАЖАЮЦЬ ВЫКЛЮЧЭННЕМ З КАЛГАСА

(Пісьмо брыгадзіра лесарубаў)

У пачатку гэтага года калгас імя Гікало (Лапіцкі сельсавет, Асіпавіцкага раёна) вылучыў на лесазагатоўкі калгаснікаў. Працавалі мы добра і леспрамгас залічыў нас штатнымі лесарубамі. Цяпер мы з'яўляемся стаханаўцамі. Норму выконваем на 500—600 проц.

Зараз праўленне калгаса пагражае выключыць нашы сем'і з калгаса. Ужо забаранілі нашым жонкам выходзіць на работу. Коней для апрацоўкі прысядзібных участкаў не даюць. Нават калі трэба было паехаць у больніцу па доктара, праўленне таксама адмовілася даць каня.

А. ВАЛОДЗЬКА.

АД РЭДАКЦЫІ. Пытанне, узнятае ў пісьме тав. Валодзька, характэрна для ўсяго Асіпавіцкага раёна. Як толькі калгаснік па згодзе з праўленнем калгаса ідзе на адыходніцтва — яго сям'ю перастаюць лічыць калгаснікамі, не прыцягваюць да працы і нават адмаўляюць у працы.

Ігнараванне сем'яў калгаснікаў-адыходнікаў дайшло да таго, што іх пачалі выключаць з калгасаў. І гэта стала звычайнай з'явай у раёне.

Што датычыць калгаса імя Гікало, Лапіцкага сельсавета, то там сем'ям лесарубаў тт. Валодзька Алеся, Романа і Міхася прысядзібныя ўчасткі адвялі не пры дварах як іншым калгаснікам, а ў канцы поля. Іх таксама хацелі выключыць з калгаса.

Для таго, каб спыніць гэта ганебнае становішча, рэдакцыя звязалася са старшынёй райвыканкома тав. Трызна, які склікаў нараду старшынь сельсоветаў і калгасаў, дзе з усёй вострасцю паставіў пытанне аб чулых адносінах да сем'яў калгаснікаў-адыходнікаў.

ДАГЭТУЛЬ НЕ АТРЫМАЎ АБЛІГАЦЫЙ

(Пісьмо ў рэдакцыю)

У 1934 годзе я працаваў у Уздзенскім раймаслапроме. Там-жа падпісаўся на пазыку 2-й пяцігодкі, выпуску другога года. Пры пераездзе ў м. Шапк аблігацый мне не далі. Пісаў аб гэтым уздзенскаму райпракурору. Адказу не было. Тады напісаў у раённую ашчадную касу, адкуль атрымаў бюракратычны адказ: «На ваша імя ў нас аблігацый трэцяга года 2 пяцігодкі няма».

Паехаць у Уздзенскі раён я не маю магчымасці, а таму прашу рэдакцыю дапамагчы мне атрымаць аблігацыі.

ГАЙДУКЕВІЧ.

НЕ ТУРБУЮЦЦА АБ БЕСКАРОЎНЫХ

(Пісьмо калгасніка)

Пры ўступленні ў калгас імя Тэльмана (Усакінскі сельсавет, Клічаўскага раёна) у 1931 годзе я абагуліў каня, жаробку і карову.

Як толькі выйшла пастанова ўрада аб надзяленні бескароўных калгаснікаў каровамі або цёлкамі я папрасіў старшыню Зайца Пятра, каб даў мне цёлку. У просьбе мне адмовілі. Нават, калі мае дзеці хварэлі грыпам, то старшыня не даў ім малака.

Такім чынам, на сёнешні дзень мая сям'я не мае ні малака, ні каровы.

А. ЗАЯЦ.

КАРОТКІЯ СІГНАЛЫ

АДНЫ ВЕЧАРЫНКІ

У інтэрнаце Менбуда (Цянская вуліца, 75) не праводзіцца культурна-масавая работа. У пакоі, прызначаным пад ленінскі куток, апрача вечарынак нічога не бывае.

ЛАЦІНІК, КАЗЛОЎ.

НАРАД ЗАМЕСТ МАТЭРЫЯЛУ

Ельская МТС яшчэ ўвосень мінулага года атрымала ад Бельсельгасснаба нарад на атрыманне матэрыялу для рамонту сельскагаспадарчых машын. Сам-жа матэрыял да гэтага часу Бельсельгасснабам не высылаецца.

ПАДАЛІНСКІ.

НЯМА ЦЫРУЛЬНІ

У мястэчку Грэск да гэтага часу няма цырульні. Старшыня раённага таварыства «Чырвоны крыж» т. Татур лічыць, што адкрыць цырульню павінен «нехта іншы», але толькі не «Чырвоны крыж».

А. КРЫЛОЎ.

БЛЫТАНІНА

Аддзел падпіскі «КОГИЗ» (Менск, Совецкая, 41) прысылаў мне наложным пладяжом два тамы твораў Шолам-Алейхема ў той час, як я выпісаў трэці том пасцітомніка твораў Леніна. З-за неахайнасці працаўнікоў «КОГИЗ» апрача мяне папярэдняй таксама нехта другі, каму належала атрымаць гэтыя творы.

ХАРХАЛЕЎ.

Зубаўцы

З надыходам цемры на балоце запаліліся электрычныя агні. Яркія палосы святла магутных пражэктараў, прымацаваных да элеватарных машын, шырока асвятляюць палі спілкі. Вось успыхнула чырвоная лямпка на суседнім багеры (тарфяны камбайн). Замільгацелі агні і ў суседніх брыгадах. Дзённую жару змяніла прыёмная вячэрняя прохаладзь. Слабенькі ветрык ледзь-ледзь калыша балотную траву, асвяжае загарэлыя твары тарфянікаў.

Элеватарная машына брыгады Зубава знаходзіцца зусім бліска ад пасёлка. Здалёк выдзяляюцца сілуэты людзей. Абапал вузкай дарожкі, якая вядзе да кар'ера, рассцілаюцца велізарныя палі спілкі. Шчыльна размешчаны майстэрскімі рукамі спільшчыкаў адна ля аднае прадаўгаватыя чорныя пагліны торфу. Адно поле, другое, трэцяе...—шэсць. Проста дзіву даешся, як хутка ідзе брыгада наперад.

— А багата набралі? — пытаем у маладога спільшчыка.

— Каля 50 тысяч пэўна будзе, —адказвае той.

Вось і кар'ер. Не чуваць гучнага говару людзей, хоць тут працуе 28 чалавек. Спакойна, без лішніх рухаў, роўнамерна кідаюць зубаўцы сваімі доўгімі і вострымі лапатамі глыбы торфу ў транспарцёр, 14 лапат чаргова апісваюць у паветры кароткую дугу ад кар'ера да транспарцёра.

Праз мінуту перамешаная маса ў машыне праходзіць праз мундштук, спрасаваная ў чатырохкутную форму. Пад лоўкімі бесперапыннымі ўдарамі секача, суцэльная чорная маса рассякаецца на пансобныя пагліны.

У начной цішы гулка аддаецца гудзенне дынамо-машыны, трэск транспарцёра, ледзь чутно гучанне калёсікаў казелкаў.

Хлопцы хваляваліся. Ужо другі раз, як свет патух. Зноў прастой. Току няма. Настрой падаў. Моўчкі стаялі, збапершыся каля машыны. Кожны думаў аб адным. Але-ж не адважыліся выказаць свае думкі ўголас. Гэта было непрыемнае і балючае адчуванне. Часцей пазіралі на брыгадзіра, чакалі, што ён скажа, каб рассеяць гэтае напружанае становішча. А ён маўчаў. Чырвоны загарэлы твар брыгадзіра выказваў поўны спакой уласцівы яго характару.

У гэты час каля кар'ера паказалася фурманка. Прывезлі вячэру. Брыгада яшчэ ўдзень, пасля абеда, заказала сабе вячэру з некалькіх блюд: боршч, свініну з макаронамі, сітро. Прывезлі ім і папяросы. Раптам з'явілася святло. За вячэрай хлопцы перакідваліся жартамі, цікавымі ўспамінамі. Сытна павячэраўшы, брыгада зноў прыступіла да работы. Калі пачалі капаць другі кар'ер, пайшоў мярэлак, прышлося прымяніць дом.

На трэцяй перасоўцы патрэбна было пераправіцца праз канаву, бо не было месца для спілкі. І якраз выпала гэта ў начны час. Рэзкі свісток матарыста. Машына стала. Пачынаецца перасоўка. Тут у брыгадзе кожны ведае сваё месца. Без усякіх лішніх распараджэнняў, шэсць чалавек пашлі на перасоўку пялежкі. Спельшчыкі пачалі перасоўваць казелкі. Астатнія засталіся каля машыны — рэйкі і шпалы пераносіць. Замацавалі на новым месцы падстаўку для машыны. Націскам вагара ўніз машына пашла наперад.

Толькі выключнай арганізаванасцю брыгады можна тлумачыць такі выдатны паказальнік — 12 мінут перасоўвалі машыну ў начны час, ды яшчэ праз канаву.

Прыступілі да апошняга — чацвертага — кар'ера. Тут ужо ўсе былі ўпэўнены, што сваё слова яны стрымаюць. Зубаў, які ўвесь час працаваў у кар'еры, пашоў на спілку — патрэбна было дапамагчы. Ён многа раз праверыў устаноўку казелкаў, каб папярэдзіць малейшы прыпынак.

Пасля вячэры Сямён Мельнікаў, — высокі статны хлапец, працуе ў кар'еры, — парэзаў руку; ён моцна перавязаў белым хустом і прадаўжаў працаваць. Не хацеў пайсці дамоў, але хлопцы настаялі і ён, незадаволены, прымушан быў пакінуць кар'ер. Але-ж Сямён не лёг спаць. Ён з нецярплівасцю чакаў хлопцаў з работы. І не паспелі яшчэ пераступіць парог інтэрната, як ён, крыкнуў: «Колькі?»

— 85 тысяч, — адазваліся ўсе хорам. Радасны смех рэзнёсся па ўсяму пакою.

— Эх, хлопцы, шкада, — няма нашага «дырэктара» спілкі. Ён-бы паказаў сёння клас работы. Трэба заўтра напісаць пісьмяцо.

Не гледзячы на такі позні час, настрой быў узняты. Здавалася, што гэтых людзей нішто не спыніць пры выкананні пастаўленай мэты. Зусім не адчувалася стомленасці. А ў гэты самы час «дырэктар» спілкі, член брыгады Зубава, Дарафеенка, недзе далёка, на паўднёвым беразе Крыма, адпачывае пад пякучымі прамянямі поўдня. Ён — адзін з лепшых стаханаўцаў брыгады — шмат па 16—17 тысяч паглін за змену, замест нормы ў 7 тыс. Пасля ад'езду Дарафеенкі спільшчык Ткачоў дасягнуў 18 тысяч. Хлопцы-ж Ткачову проста гаворыць: «Твё шчасце, што няма «дырэктара». Як прыедзе, усё роўна перагоніць.

Трэці год працуе Зубаў брыгадзірам на заводзе «Большэвік».

У мінулым сезоне ён першы ў БССР скончыў торфсезон, выканаўшы заданне на 185,9 проц. Сваім асабістым прыкладам ён вучыць людзей, арганізоўвае работу так, каб кожны член брыгады адпавядаў свайму месцу. Хлопцы паважаюць і любяць свайго брыгадзіра.

Аб брыгадзе Зубава ідзе слава далёка за ваколіцы завода. — Аб брыгадзе Зубава прачытаў у газеце ў 1934 г., — расказвае малады калгаснік Лоеўскага раёна Сямён Мельнікаў, — калі я прыехаў на торфзавод, то адразу папрасіўся ў брыгаду Зубава.

Зубаўцы не толькі самі працуюць добра, яны вучаць і другіх.

Брыгада Зубава з'яўляецца кузняй кадраў для завода. За апошнія два гады пашлі з брыгады начальнікамі змен: Хаменкоў, Навіцкі, Кулагін, Тарасенка; слесарам — Кліменкоў, электраманцёрам — Макеенка, брыгадзірам — Гладчэнка.

Вестка аб рэкордзе брыгады Зубава маланкаю разнеслася па ўсіх участках. Многія брыгады пачалі пахватацца да спаборніцтва. Але-ж з Зубавым спаборнічаць не так лёгка. Ён свайго першынства не здасць.

І. ТУРЭЦКІ.

Гомель, торфзавод «Большэвік».



Многія рабочыя Кіраўскага завода (Ленінград) ахвотна праводзяць вечары ў сваім клубе. Тут у велізарных залах і ўтульных пакоях клуба можна добра адпачыць, павесяліцца, патанцаваць, пагутарыць з таварышом, згуляць у шахматы, праглядзець новыя журналы і кнігі. НА ЗДЫМКУ: вячэра ў кафе-рэстаране клуба Фото МАЗЕЛЕВА і ЗІВОРТА (Саюзфото).

ПРАЗ ТРЫ МЕСЯЦЫ

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б ад 9 лютага аб культасветрабоце на вёсцы з'явілася праграмай канкрэтных мерапрыемстваў па ўздыму культурнай і палітычнай работы на вёсцы. Гэта пастанова яшчэ раз паказала, якія выключныя клопаты праяўляе ўся партыя, ЦК КП(б)Б да калгаснікаў, да іх культурнага росту.

Прайшло больш 3 месяцаў. Цяпер ужо можна падвесці некаторыя вынікі праробленай работы. Трэба адзначыць, што зусім мала зрабілі па рэалізацыі гэтай пастановы органы Наркомасветы. За зімовы перыяд трэба было арганізаваць 5 тысяч навуковых папулярных лекцый. Прачытаны толькі 2.021. Сіламі тэатраў БССР трэба было арганізаваць і правесці 100 спектакляў, не праведзен ні адзін. Наркомасветы абмежваўся тым, што замацаваў тэатры за раёнамі, вызначыўшы колькасць спектакляў па кожнаму раёну. Як праводзяцца ў жыццё вызначаныя мерапрыемствы, гэта, відаць, не так важна. Галоўнае, каб фармальна ўсё было ў парадку.

Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі павінна было выдаць масавым тыражом такія кніжкі, як «Палнятая цаліна» Шолахава, «Як гартавалася сталь» Островскага, «Цусіма» Новікава-Прыбоя, «Дзень другі» Эрэнбурга і інш. Але яно выпусціла гэтыя кнігі надзвычай абмежаваным тыражом. Горшым такія кнігі, як кніга Островскага «Як гартавалася сталь» і «Дзень другі», па сваёй цане недаступны для масавага пакупніка.

Белдзяржкіно арганізавала за першы квартал 24 тысячы кіносеансаў, якія наведала 1.161 тысяча глядачоў. Пачалі працаваць 28 гукавыя аўтакінаперасоўкі. У калгасах устаноўлена 5 гукавых кіноперасовак. Гукавыя кіностацыянаркі ў калгасах і [illegible] цэнтрах пачалі ўстанаўліваць толькі з 1 красавіка ў сувязі з тым, што гукавую стацыянарную апаратуру атрымалі толькі ў другой палове сакавіка. Такія стацыянаркі ўжо ўстаноўлены [illegible]ройску, Глуску, Сіроціне, Чэрвені, Дрыбіне і Старых Дарогах. Устаноўлены таксама і ў 7 калгасах: імя Тэльмана (Старыя Дарогі), «Комуна БВА» (Любань), «Перамога» (Капыль), «Чырвоны бцен» (Дзяржынск), «Ціцінкі» (Гомель), «Чырвоны араты» (Полацк), Астрашыцкі Гарадок (Менск).

Значна палепшыўся фільмфонд. Пасланa каля 500 экземпляраў розных фільмаў. Па колькасных паказальніках Белдзяржкіно перавыканала свой план, даўшы з 40 тысяч кіносеансаў гадавога плана 24 тысячы сеансаў за адзін першы квартал. Але дрэнна тое, што няма належнай сувязі Белдзяржкіно з раёнамі. Мала пасылаць аўтакіноперасоўку. Трэба праверыць, як яна працуе, як яе скарыстоўваюць у раёне. Тады не атрымалася-б так, як у Капаткевіцкім раёне. Старшыня РВК т. Арапутчык аўтакіноперасоўку скарыстоўваў для гаспадарчых патрэб. Машына пасылалася ў Калінкавічы па бензін, а алтуль прывозіла піва. Скарыстоўвалася таксама для развозкі артыстаў, пасажыраў з вакзала. Сем нямых кіноперасовак таксама не працуюць.

У Кармянскім раёне добра наладзілі работу перасовак, прычым сакратар райкома асабіста ўстанавіў маршрут абслугоўвання кінофільмамі. Белдзяржкіно забрала кіномеханікаў і перакінула ў Віцебск. Абяцалі прысылаць другіх, але і дагэтуль нікога не прысылаюць.

Не праявіў належнай аператыўнасці і БАКТ. Доўгі час загадчык БАКТ'а тав. Любіч гадаў купіць ці не купіць бутафоры і грым калгасныя гурткі самадзейнасці. Сапраўды аказаўся вялікі попыт. Завезена ў раёны на 26 тысяч бутафорыі і грыму. Гэта колькасць зусім недастатковая для задавалення попыту калгасных гурткоў самадзейнасці.

Немалая доля віны падае і на раённыя арганізацыі, якія недаацанілі важнасць гэтай работы. Там, дзе раённае кіраўніцтва сур'ёзна ўзялося за гэту справу, работа значна палепшылася. Па Мазырскай акрузе за наладжанне культасветработы ўзяліся самі сакратары акругкома тт. Ананеў і Раманенка. За гэты перыяд пасля пастановы адрамантавана і абсталявана 26 новых чырвоных куткоў.

Немалая работа праведзена па Полацкай акрузе. На прэзідыумах РВК былі заслуханы інфармацыі загадчыкаў райвна і палітінспектароў. Праведзена праверка ўсіх палітасветработнікаў на вёсцы і скамплектаванне людзьмі, падыходзячымі да гэтай надзвычай адказнай работы. Чырвоных куткоў да пастановы было 91, зараз — 219. Рэгулярна працуюць 67 літгурткоў. Праведзены алімпіяды калгаснай самадзейнасці.

Інакш пастаўлена культасветработа па Слупкай акрузе. Замест таго, каб укамплектаваць добрымі кадрамі гэты ўчастак, лепшых людзей знімаюць і пераводзяць на іншую работу.

Вынікі першых трох месяцаў гаворыць аб тым, што па рэалізацыі пастановы ЦК КП(б)Б зроблена яшчэ вельмі мала. Няма яшчэ карэннага паляпшэння культасветнай работы на вёсцы. Мясцовыя арганізацыі не зразумелі, што наладжанне культасветработы з'яўляецца важнейшым абавязкам партыйных і камсамольскіх арганізацый, сельсоветаў і праўленняў калгасаў. Не праявілі патрэбнай настойлівасці і цэнтральныя ўстановы.

Трэба, каб веснавыя і летнія палявыя работы суправаджаліся практычным ажыццяўленнем пастановы ЦК па ўсіх пунктах, каб справа культурна-асветнай работы на вёсцы сапраўды стала справай усіх партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый.

ФАКТАРОВІЧ.

ДАВОЛІ БЛЫТАНІНЫ

20 мая чарговая выплата зарплаты настаўнікам па новых стаўках. Пры першай выплаце ў многіх раёнах былі дапушчаны ўпны скажэнні пастановы партыі і ўрада.

У **Добрушскім** раёне заработная плата настаўнікам выдавалася са спазненнем. Настаўнікі горада замест 16 красавіка атрымлівалі 20-га. Больш таго, зарплата выдавалася няправільна.

Загадчык Крагоўскай пачатковай школы замест 200 р. у месяц атрымаў чамусьці 405 руб. Настаўнік Дзямяноўскай няпоўнай сярэдняй школы незаконна атрымаў на 20 проц. больш.

Такое-ж неразуменне і блытаніна пастановы наглядаецца і ў Петрыкоўскім раёне. У пастанове ЦК і СНК сказана ясна, што асобы, скончыўшыя двухгадовыя інстытуты атрымліваюць па другому разраду. Але чамусьці настаўнік першай Петрыкоўскай поўнай сярэдняй школы тав. Юркевіч атрымаў па першаму разраду.

Ёсць факты, калі настаўнікі, не зразумеўшы асобных пунктаў пастановы партыі і ўрада, патрабуюць выплаціць розніцу за студзень, люты і сакавік. Аб гэтым сведчыць пісьмо настаўнікаў з Плешчаніцкага раёна.

Школьнае кіраўніцтва Наркомасветы на чале з тав. Хейфецам яшчэ да сёнешняга дня не пастаралася шырока растлумачыць пастановы партыі і ўрада аб заработнай плаце.

Даволі блытаніны! Неабходна дэтальна растлумачыць загадчыкам райана, дырэктарам школ і настаўнікам пастанову партыі і ўрада з тым, каб 20 мая настаўнікі вясковых школ атрымалі заработную плату праільна і без малейшых адхіленняў ад пастановы.

АБ АДНЫМ ШКОДНЫМ ЗАХАПЛЕННІ

Калі вучань Нахаўскай НСШ, Мазырскага раёна, пажадае купіць спытак, яму не так лёгка гэта даецца.

Настаўнікі гэтай школы і загадчык крамы № 9 не знайшлі лепшага сродку для скарыстання адпачынку вучняў, як збор уцілю.

Калі прынясеш кілограм, ці колькі ўцілю — атрымаеш спытак. Калі-ж уцілю няма, дык доўга трэба енчыць, пакуль загадчык крамы тав. Таранок не «злітуецца» і дасць некалькі спыткаў. Такая пастаноўка пытання нічога агульнага з выхаваннем дзяцей не мае. Гэты парадак водпуску спыткаў груба парушае пастановы СНК і ЦК ВКП(б).

Час ужо зразумець, што трэба скончыць з крыхаборніцкай практыкай скарыстання вучняў, яны павінны мець весёлы, жыццерадасны культурны адпачынак.

К—м.

ТРАКТАРЫСТЫ-СТАХАНАЎЦЫ АБ СВАЕЙ РАБОЦЕ

ГЭТА ТОЛЬКІ ПАЧАТАК

З першых дзён палявых работ, я на сваім трактары «ХТЗ» выпрацоўваю не менш як па 8—9 гектараў мяккага ворыва ў змену. 3 мая выпрацоўка мая ўзрасла да 20,23 гектараў. За гэта я зарабіў 87 руб. і 105 кілограмаў хлеба.

І вось цяпер часта пытаюць, якім-жа гэта чынам мне ўдалося ў гэтым годзе дабіцца такіх рэкордаў, калі ў мінулым годзе пры тых-жа умовах я нічым не адрозніваўся ад астатніх трактарыстаў.

І сапраўды, як гэта здарылася? Калі добра падумаць над пастаўленым пытаннем, то адказ напрашваецца адзін: мне не захацелася адставаць ад перадавых людзей нашай краіны. Бывала, у мінулым годзе падцягнем выпрацоўку да нормы, заглушым матор, а самі — я і зменны —на абед, а то проста пасядзім, пакурым.

А зараз не тое. Мы інакш адыходзімся з машынай. Яна заўсёды ў нас чыстая, змазаная і спраўная. Я добра яе вывучыў.

Але не толькі ад гэтага залежыць поспех у рабоце. Калі я прыязджаў у новы калгас, я перш за ўсё знаёміўся з палямі. Скажам, мне брыгадзір гаворыць, што трэба ехаць на такі-та ўчастак. Перш чым паехаць, я сходжу і сам гляну на адведзены ўчастак. І бывае скажу брыгадзіру, каб ён даў мне другое месца, а то проста добра азнаёмлюся з полем, выстаўлю на мокрых месцах сігнальныя вешкі і такім чынам не дапушчаю буксоўкі.

Калі я добра вывучу глебу і машыну, то мне лёгка ўдаецца скарыстоўваць трэцюю скорасць, а гэта значна павышае прадукцыйнасць працы.

Многа таксама залежыць ад брыгадзіра і запраўшчыка, а яны ў нас старанныя хлопцы. Ніколі не было выпадку, каб наш брыгадзір Цвірко, або запраўшчык Пятроўскі пакінулі мой трактар без гаручага і змазачнага.

Звычайна я працую ў начную змену. Гэта прымушае мяне асаблівую ўвагу звяртаць на асвятленне. З пярэдняй фары святло пускаю далёка ўперад, а з крыла — пад пярэдняе кола трактара. Такім чынам я пазбягаю агрэхаў.

Адным словам, увесь сакрэт у тым, што я добра наперад улічваю ўсе ўмовы і папярэджваю нечаканасць.

Трэба адзначыць, што такім «здагадлівым» не будзеш без вучобы. Вось і зараз, не гледзячы на рэкорды, я сам вучуся і вучу свайго зменнага тав. Саўчанка. Хаджу да яго на поле, паказваю што і да чаго. Цяпер ён мала адстае ад мяне.

Сам я вывучаю шыроказахватную ільноперабілку. Ужо зараз адчуваю, што і на гэтай машыне, будучы начальнікам агрэгата, я, безумоўна, не зніжу, а яшчэ павышу тэмпы работы.

Лічу, што цяперашнія мае рэкорды — толькі пачатак сапраўды стахановскай работы. Ды ці можа быць інакш, калі жывецца радасна, калі ўся краіна ў сваёй штодзённай рабоце вучыцца ў вялікага Сталіна.

САРАЧЫНСКІ НІКАЛАЙ —
трактарыст-стахановец Талачынскай МТС.

ПАРУШАЛЬНІКІ ПРАВІЛ ПЛАВАННЯ

У канцы красавіка буксірны параход «Дзем'ян Бедны» паваліў на лёдарэз мазырскага разводнага маста гружаную баржу № 66. Баржа з грузам у 160 тон затанула. Аварыя адбылася па прычыне нясвоечасовай разводкі маста, у выніку чаго параход зрабіў вымушаны абарот і паваліў судно на лёдарэз.

Каля мазырскага маста адбываюцца аварыі даволі часта. Тлумачыцца гэта злачыннай бестурботнасцю майстра маста Цыпорына. На месце няма адрозніваючых сігналаў у дзенны і начны час. Цыпорын груба парушае існуючыя правілы плавання, нясвоечасова выстаўляе на месце сігналы і не сочыць за іх спраўнасцю.

АНАПРЭЙЧЫКАЎ.

С. СЕМАШКА

Знатны чалавек

Калі глядзіш на рухавасць Міхася Яўменавіча Харэні, на яго бадзёрасць, на жыццерадасную яго ўсмешку, не хочацца верыць, што чалавек гэты пакінуў ужо за сваімі плячыма пяць з лішкам дзесяткаў год. Дый сам Міхась Яўменавіч неахвотна прызнаецца ў гэтым.

— Дарма, што я пражыў больш за поўсотню год, выгадаваў чатыры сыны і шэсць дачок, маю ўжо ўнукаў, а адчуваю сябе зараз маладым, — гаворыць Міхась.

Харэнь смяецца скрозь рэдкія зубы і, мапаючы хударлявай рукой вялікую праз усю галаву лысіну, дадае:

— Вось толькі лысіна гэта, ды сівізна валасоў, што засталіся каля вушэй, ганьбяць мяне, не даюць схаваць старасць. Але нічога!.. На рабоце не кожны малады ўгоніцца за мною.

Гэта зусім правільна. Правільна, што не кожны з маладых зможа выканаць тую работу, якую выконвае зараз у сваім калгасе Міхась Яўменавіч.

***

Яшчэ ў 1930 годзе, у часе арганізацыі ў вёсны Дзевіна калгаса, як выбралі Міхася Яўменавіча старшынёй калгаса, дык і па сёнешні дзень ён бязменна кіруе калектыўнай гаспадаркай.

Нямала за шэсць год перажыў калгас «Новае жыццё» ўсякіх цяжкасцей. Шмат прышлося папрацаваць Яўменавічу, як арганізатару калгаса. Толькі ўпартая настойлівасць калгаснікаў, ды ўмелае кіраўніцтва калгасам не дало кулацтву магчымасці разбурыць у Дзевіне калгас.

З кожным годам калгас «Новае жыццё» рос і мацнеў. З 18 гаспадарак пры арганізацыі калгас вырас у 120 гаспадарак. Вёска Дзевіна ператварылася ў калгасную суседнія хутары і пасёлкі, раскінутыя калісьці Сталыпіным і Прышчэпавым па тэрыторыі сучаснага Клюкаўскага сельсавета.

За шэсць год калгас выключна сваімі сіламі і сродкамі шмат чаго набыў і пабудаваў. Пабудаваны два кароўнікі — адзін на 100 галоў жывёлы, а другі на 50. Пабудавалі канюшню, вялікі хлеў пяць свірнаў, кузню, дзіцячыя яслі... Калгас мае вялікую малочна-таварную ферму, аўпагадоўчую і свінагадоўчую. Набыты касілкі, жняяркі, малатарні і іншыя сельска-гаспадарчыя машыны і інвентар.

— У гэтым годзе абавязкова купім аўтамашыну, — гаворыць Міхась Харэнь.

Па сваёй моцнасці і па выкананню ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній калгас «Новае жыццё» лічыцца перадавым калгасам не толькі па Клюкаўскаму сельсавету, але і па ўсяму Багушэўскаму раёну. У мінулым годзе калгас лепш за ўсе калгасы ў раёне справіўся з усімі сельскагаспадарчымі работамі і першым выканаў свае абавязацельствы перад дзяржавай. Прадаў 26 тон хлеба дзяржаве і 7 тон ільносемя. Звыш плана здаў дзяржаве 12 пэнтнераў ільновалакна.

Веснавую сяўбу сёлета калгас закончыў адным з першых па раёну. Зерневыя і лён засеяны да 10 мая, а бульба пасаджана да 14 мая. План веснавой сяўбы па многіх культурах перавыкананы. Ільну, напрыклад, трэба было засеяць 47 гектараў, а засеяна 49 гектараў. Усе пасевы праведзены высокаякасна і па ўгноенай глебе. Увесь гной і курыны памёт вывезен пад яравыя, 10 тон рассеяна мінеральных угнаенняў. Праведзены падкормка азімых.

Вялікая работа праводзіцца па палепшэнню сенажацей. У калгасе вылучаны спецыяльныя людзі, якія кожны год з ранняй вясны і да позняй восені працуюць на зямляных работах: капаюць канавы, зразаюць куп'ё, цярэбяць кусты. Там, дзе раней нельга было прайсці чалавеку, нічога не расло апрача дзікага моху — зараз у калгасе «Новае жыццё» праводзіцца распашка. Балоты ператвараюцца ў карысныя сенажаці.

***

У канцэлярыі калгаса сядзеў адзін толькі рахункавод — рыхтаваў для райземаддзела весткі.

— Дзе можна бачыць старшыню калгаса? — запыталі прыезджыя.

Рахункавод, ўглядаючыся ў раскладзеныя на стале паперы, безахвотна працадзіў скрозь зубы:

— Наш старшыня не сядзіць у канцэлярыі, ён у брыгадах...

— А калі яго можна будзе ўбачыць?

— Хто яго ведае... Можа і хутка прыдзе, а можа і да вечара не прыдзе. Сёння ў нас канчаюць сяўбу, дык вось ён і пайшоў аглядаць, прымаць участкі.

Хутка прышоў і Міхась Харэнь. Да поўдня ён паспеў пабываць ужо ў двух брыгадах, агледзець толькі што заараныя ўчасткі зямлі, паглядзець, як ідуць ранняя пасевы. На дарозе ён заглянуў на луг, дзе капалі канаву...

Міхась Яўменавіч нічога не мінае. Ад яго гаспадарнага вока ніхто не можа нічога захаваць, ён заўсёды заўважыць нават самую малейшую дробязь. І не толькі заўважыць. Міхась дасць заўсёды калгаснику таварыскую талковую параду і нават сам дапаможа знішчыць той ці іншы недахоп.

Такі ўжо стыль работы ў Міхася Яўменавіча Хатэні.

Вярнуўшыся пяпер з брыгады, Хатэня запытаў у рахункавода:

— Ці паехалі па сялітру?

— Паехалі, дзядзька Міхась, — адказаў рахункавод.

Хатэня прысеў на лаўцы каля стала, выцер буйныя кроплі поту, што сцякалі з ілба на твар.

— Вось сёння, дык цёпла, — прамовіў ён.

— Хай-бы ўзялі каня, ды вярхом... Абыйсці пяць брыгад цяжка, гэта маладому і то хопіць, а вы-ж стары чалавек.

Міхась Хатэнь махнуў толькі рукою.

— Шкода, браце ты мой, адрывань каня ад работы. А мне абыйсці брыгады — невялікая цяжкасць, я на нагу лёгак яшчэ.

Ды, як відаць, стары Міхась і не адчувае стомы. Яго думкі заняты другім. Ідучы з брыгад ён склаў ужо ў галаве план далейшых работ у калгасе.

— Дзве тоны сялітры, што прывязуць сёння з Багушэўска, трэба пасеяць па-жыту і зрабіць падкормку ільну. Трэба ўсе сілы аддаць, каб атрымаць сёлета ўдвая большы ўраджай ільну, чым летась. Праполку ільну будзем праводзіць не менш трох раз.

Хатэнь не можа нарадавацца пасевамі. Ён з захапленнем расказвае:

— Вось, браце ты мой, распе ранняе!.. Авёс і ячмень — шчоткай заняўся, вельмі прыгожа ўзышоў. Ну і якасць работы ў нас сёлета добрая, угнаення далі як належыць, не шкадуючы... Адным словам павінен быць добры ўраджай. Заўтра пераключаемся на пад'ём папару.

... Былы бядняк, непрыкметны ў мінулым, Міхась Яўменавіч Хатэнь зараз лепшы кіраўнік буйнай калектыўнай гаспадаркі, знатны чалавек калгаснай вёскі.

Калгас «Новае жыццё», Багушэўскага раёна.

У КІРАЎНІЦТВЕ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

У кіраўніцтве па справах мастацтваў пры СНК БССР створаны тры аддзелы. Загадчыкам тэатральнага аддзела прызначан тав. Модэль, загадчыкам аддзела выяўленчага мастацтва і архітэктуры — тав. Квалінскі, загадчыкам музычнага аддзела — тав. Прагін (БЕЛТА).

РЭКАНСТРУКЦЫЯ БАРЫСАВА

БАРЫСАЎ, 16 мая. (Па тэлефону). У Барысаў нядаўна прыбыла група інжынераў кіеўскага інстытута па праектаванню гарадоў. Прыбыўшыя разам з інжынерамі Белдзяржпраекта вывучаюць становішча прамысловасці і транспарту, знаёмяцца з фондам жыллёвага будаўніцтва і размяшчэннем горада ў мэтах падрыхтоўкі праекту рэканструкцыі Барысава.

Першы этап работ па праектаванню павінен скончыцца ў гэтым годзе. Будуць распрацаваны пытанні водазабеспячэння, каналізацыі, газазабеспячэння і энергетыкі, жыллёвага будаўніцтва і пабудоў культурнага абслугоўвання. Праектныя работы праходзяць пад кіраўніцтвам праф. Эйнгорна.

ІВАШЫН.

АБ МЕДЫЦЫНСКІХ «ПАМЫЛКАХ»

15 мая ў клубе імя Сталіна адкрыўся многалюдны сход менскіх урачоў, навуковых работнікаў медыцынскіх устаноў і выпускнікоў Беларускага медыцынскага інстытута па пытанню аб медыцынскіх «памылках», якое ўзнята на старонках «Правды». 16 мая быў працяг схода.

ДРАМГУРТКІ БЕЗ П'ЕС

СЯННО. У многіх калгасах раёна арганізаваны драматычныя гурткі. У рабоце іх прымае ўдзел не толькі моладзь, але і дарослыя калгаснікі. Але ў распаўсюджанні гурткоў ёсць усяго па дзве-тры п'есы. З прычыны адсутнасці п'ес некаторыя гурткі паспаблякоць сваю работу. У гарадскіх кнігарнях не заўсёды можна купіць новую п'есу для калгас.ага драмгуртка.

А. МАХНАЧ.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАВАЛЕРЫЙСКАЯ ШКОЛА АСОАВІЯХІМА

У прыгарадным соўгасе «Чырвоны маяк», пад Менскам, Цэнтральны совет Асоавіяхіма БССР арганізаваў усебеларускую кавалерыйскую школу. Школа будзе выпускаць інструктароў для гурткоў варашылаўскіх кавалерыстаў у калгасах. Зараз ідзе адбор курсантаў у школу.

НА ЗДЫМКУ: д-р Эмануіл Ласкер, былы чэмпіён свету па шахматах, у сяе у Мюнхене за шахматнай дошкай. (Фото Кудаярава (Белсаюзфото).

Лета ў Бабруйску

БАБРУЙСК, 16 мая. (Кар. «Звязды»). З надыходам вясны горад у зеляніне. Цвітуць сады. Прыемна такой парою, асабліва пад вечар, выйсці пасля працы на вуліцу. Але таго, хто адважыцца гэта зробіць, праз дзесяць крокаў пасцігне расчараванне.

На сушы стуча густога пылу. Нібы смерч, ён узнімаецца вышэй дамоў і пакрывае ўсё сустрэчнае, лезе ў нос, рот, дабіраецца да лёгкіх. Гэта дворнікі вышлі на работу.

Перамагаючы самога сябе, выпрарываецеся скрозь пыльную заслону ў надзеі кампенсаваць усё гэта прыемным адпачынкам у гарадскім садзе. Але, зайшоўшы ў сад, вы чамусьці адчуваеце не чароўны пах кветак, а... смурод прыбіральні. У гаты час жраз выязджае на «аперацыю» асенізацыйны абоз.

Вада — прадмет першай неабходнасці, а вось з надыходам лета яна ў Бабруйску стала дэфіцытнай рэчу.

На працягу сутак водаправод толькі 2—3 гадзіны больш-менш рэгулярна падае ваду. У лазню лепш і не хадзіць: не паспееш намыліцца, як знікае вада, а тады сядзі гадзінамі і чакай...

Ёсць у Бабруйску завод газаваных вод. Аднак, ні ў адным з ларкоў нельга знайсці газаванай вады. Наконт піва нямы чаго і гаварыць.

У свой час гарадскі совет абрадаваў жыхароў, што на галоўных вуліцах горада хутка будуць устаноўлены электрычныя гадзіннікі. Прайшло вельмі шмат часу, а ў горадзе па-ранейшаму дзейнічае толькі адзін старажытны гадзіннік. З трох цыферблатаў кожны паказвае час па-свойму. Нямала даверлівых людзей папярпелі з-за гэтага гадзінніка.

Так, Бабруйск, дакладней бабруйскі гарадскі совет, сустрэў лета.

П. ЧЫКУН.

ТРЭЦІ МАСКОЎСКІ МІЖНАРОДНЫ ШАХМАТНЫ ТУРНІР

ДРУГІ І ТРЭЦІ ТУРЫ

МАСКВА, 16 мая. (БЕЛТА). 15 мая іграўся другі тур трэцяга маскоўскага міжнароднага шахматнага турніру.

Другі тур турніру азнаменаваўся радам найпіказейшых партый, каштоўнасць якіх, адная, парушана пайтнотам (недахватам часу для абдумвання ходаў).

У ігры чорнымі супроць Флора Капабланка выбраў варыянт, прыменены ў вядомых партыях Капабланка—Тартакавер і Відмар—Тартакавер. Праціўнікі згадзіліся на нічыю.

Мірна таксама скончылася партыя Ліліенталь—Ласкер. Спробы Ласкера абвастрыць ігру не далі жаданых разультатаў і пасля разменду ферзяў партыя на 20-м ходзе скончылася нічыю.

Тры партыі к перапынку засталіся нясканчанымі.

З пераменным поспехам праходзіла барацьба паміж гросмайстрам Батвіннікам і чэмпіёнам Масквы Румінным. У адкладзеным становішчы пазіцыі Руміна некалькі лепшыя.

Левенфіш (чорныя) у англійскай партыі супроць гросмайстра Элісказеса метадычна атакаваў каралеўскі фланг праціўніка. К перапынку партыя адкладзена прыкладна ў аднолькавым становішчы.

***

МАСКВА, 16 мая. (БЕЛТА) Пасля перапынку на шахматным турніры Элісказес адаў партыю Левенфішу. Партыя Батвіннік — Румін адкладзена. Таксама адкладзена партыя Рагозін — Кан у пройгрышным становішчы для Рагозіна.

***

МАСКВА, 16 мая. (БЕЛТА). 16 мая ў трэцім туры чэмпіён Ленінграда Рагозін бліскуча выйграў у гросмайстра Флора. Партыя закончылася на 36-м ходзе.

Румін, іграючы чорнымі, «заўнуў» ферзя і вымушан быў на 27-м ходзе здаць партыю экс-чэмпіёну свету Капабланку.

Гросмайстар Батвіннік выйграў партыю ў Ліліенталя. Экс-чэмпіён свету Ласкер дабіўся перамогі ў чэмпіёна Аўстрыі Элісказеса.

Партыя Левенфіш—Кан закончылася ў нічыю.

Такім чынам, у трох сустрэтах з замежнымі гросмайстрамі совецкія шахматысты заваявалі дзве перамогі.

ДЗІЦЯЧЫ ДОМ

(Ад палескага карэспандэнта «Звязды»)

Браты Іофе засталіся маленькімі без бацькоў. Яны было 4 гады, а Федзі — 6. Калі-б гэта здарылася ў дарэволюцыйны час, дзяцей напаткала-б звычайная «сіроцкая доля». У Краіне советаў Яша і Федзя выраслі і вучацца зараз у вышэйшых навучальных установах. Першы хутка будзе ўрачом, а другі інжынерам.

У пісьмах на імя загадчыцы мазырскага дзіцячага дома Рахілі Іраілеўны Офінгендзінай абодва часта ўспамінаюць пра сваё дзяцінства і ад душы дзякуюць усім, каму абавязаны сваім выхаваннем. Асабліва ўдзячны яны дзіцячаму дому і яго загадчыцы.

У мазырскім дзіцячым доме выхавана больш 300 дзяцей. Многія з іх зараз камандзіры РСЧА, урачы, інжынеры, аграномы, настаўнікі і т. д.

Першы дзіцячы дом на Палессі быў арганізаван у Мазыры ў 1920 годзе. Загадчыцай яго была прызначана Р. І. Офінгендзіна. З вялікай любоўю і адданасцю ўзялася яна за выхаванне дзяцей.

Працаваць спачатку было нялёгка. Асабліва цяжка было перажыць час акупацыі горада балахоўцамі. Усе ўстановы эвакуяваліся, Рахіль Іраілеўна засталася з дзецьмі ў горадзе. Прадукты былі на зыходзе, грошы таксама. Але Офінгендзіна не пакінула свайго паста і, упэўненая, што большэвікі хутка вернуцца, прымала ўсе меры да таго, каб не дапусціць развалу дома.

Як толькі ў горад увайшлі часці Чырвонай арміі, клапатлівая Рахіль Іраілеўна адразу накіравалася ў штаб прасіць дапамогі. Там яе ўважліва выслухалі і ўзялі часова дзіцячы дом, пакуль у горад вернуцца эвакуяваныя ўстановы, на ваеннае снабжэнне. Умацавалася совецкая ўлада ў горадзе і дзіцячы дом зажыў поўнакроўным жыццём.

Для выхавання дзяцей былі створаны нармальныя ўмовы. Дому было адведзена адно з лепшых памяшканняў у горадзе. У пакоях з'явіліся новенькія жалезныя ложкі, засланыя белымі простынямі і наўлечкамі. Дзеці раслі сытыя, абутыя і апранутыя. Дом і школа прывялі ім навыкі калектывізма і выхоўвалі іх.

У 1927 годзе дзіцячы дом быў рэарганізаваны ў дашкольны. Зараз у ім выхоўваюцца 68 дзяцей дашкольнага ўзросту. Сытыя і чыстыя яны гуляюць у прасторных светлых пакоях, на зялёнай траве, купаюцца ў рацэ. Да іх паслуг безліч рознастайных цацак. Яны спяваюць і танцуюць, вывучаюць азбуку і рыхтуюцца да паступлення ў школу.

Мазырскі дашкольны дом — адзін з лепшых у рэспубліцы. У маі яму споўнілася 16 год. На працягу ўсяго часу ім загадвае тав. Офінгендзіна, якую Наркомасветы БССР нядаўна прэміраваў месячным акладам.

НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ ФУТБАЛІСТЫ БВА

Пасля ліўня футбольнае поле размокла і стала слізкім. Дуў халодны, пранізваючы вецер. На трыбунах усебеларускага стадыёна 15 мая было мала глядачоў.

На полі капашацца каманды «Дынамо» і профсаюзаў. Яны аспрэчваюць другое і трэцяе месцы ва ўсебеларускім розыгрышы па футболу. Абедзве каманды іграюць вяла. Каманда «Дынамо», якая некалі славілася, захавала толькі сваю назву, згубіўшы тэхніку ігры і волю да перамогі. Не верыцца, што гэта каманда тэрміравалася на поўдні. Цяпер прыходзіцца шкадаваць аб згубленых сродках. Але калі гаварыць аб сродках, дык неабходна напомніць аб паездцы ў Одэсу футбольнай каманды профсаюзаў.

Бюро фізкультуры ЦСПСБ паслала сваю каманду чамусьці на поўдзень, тады як сонца ў Менску грэла моцна і патрэбы ў трэніроўцы на поўдні не было. Клас ігры футбалістаў профсаюзаў нізкі.

Забіўшы адзін другому па мячу, абедзве каманды зрабілі перапынак. Толькі ў другім тайме дынамаўцы больш выпадкова, чым падрыхтавана, забілі яшчэ два мячы. 3:1 — з такой перамогай пакінулі дынамаўцы поле, з труднасцямі заваяваўшы другое месца.

Каманды БВА і «Спартак» іграліі значна жывей. Пасеўшы спачатку на вароты «Спартака», выдатныя футбалісты БВА ўжо не «залязалі» з іх да канца матчу. Хуткі тэмп, прапанаваны камандай БВА, быў не пад сілу для каманды «Спартака», хаця яна аказала значнае супраціўленне. Толькі на 23 мінуце з вароты «Спартака» ўляцеў першы мяч. Другі мяч «Спартак» атрымаў штрафны. Футбалісты БВА, ў другім тайме забілі «Спартаку» яшчэ 4 мячы: 6:0. Гэты разультат замацаваў за камандай БВА першае месца. «Спартаку» дасталася апошняе.

І. ЦЫВЕС.

ЛІЎНЕВЫЯ ДАЖДЖЫ З НАВАЛЬНІЦАМІ

14 і 15 мая па БССР прайшлі невялікія ліўневыя дажджы з навальніцамі. Мясцамі выпаў град. Гэта выклікана рэзкім абастрэннем атмасферы — заменам цёплага паветра халодным. У сувязі з гэтым значна знізілася тэмпература. У Полацку 16 мая мінімальная тэмпература ўпала з 9 да 1 градуса цяпла, у Менску — да 5 градусаў. Як паведамілі ў гідраметслужбе БССР, пахаладанне пратрымаецца 2—3 дні. Град не прычыніў шкоды пасевам і садам. (БЕЛТА).

ПАРК У КЛІМАВІЧАХ

КЛІМАВІЧЫ. Гарадскі парк прыведзен у парадак. Дарожкі пасыпаны пяском, зроблены клумбы, пасаджаны кветкі. Сухія дрэвы выкарчаваны і на іх месца пасаджаны новыя. У парадак прыведзены спартыўная пляцоўка і парашутная вышка.

Г. АРТ.

Завод імя Варашылава (Менск) асвоіў выраб прадольна-стругальных варштатаў, якія дазваляюць апрацоўваць дэталі даўжынёй да 2 метраў пры шырыні 500 мм. У гэтым годзе завод выпусціць 150 такіх варштатаў. НА ЗДЫМКУ: брыгадзір зборачнай брыгады т. Ксеневіч правярае якасць зборкі новага варштата.

Фото Бусько (Белсаюзфото).

ЗДАРЭННІ

* **Пажар.** 5-гадовы сын калгаснікі Мінкевіч з калгаса «Завет Ільіча», Аляксандраўскага сельсовета, Шклоўскага раёна, якога бацькі пакінулі аднаго дома, узяў запалкі і падпаліў салому. Узнік пажар, якім былі знішчаны хата і надворныя будынкі.

* **Афяра неасцярожнасці.** Учора каля гарадскога сквера па Совецкай вуліцы кандуктар менскага трамвайнага парку С. Банкецік на поўным ходу трамвая саскочыла з задняй падножкі пярэдняга вагона і трапіла пад колы. Банкецік, якой адрэзала ногі, дастаўлена ў больніцу.

ПАВЕДАМЛЕННІ КПК

Парткалегія пры ўпаўнаважаным КПК пры ЦК ВКП(б) па Беларусі паведамляе, што 19 мая гг. у 10 г. дня, у г. Менску (памяшканне ЦК КП(б)Б, II паверх, пакой 32) парткалегія будзе разглядаць партсправы наступных таварышоў:

Казакова Д. (Чэрыкаў), Зібарава С. Д. (Асвея), Капельчука А. Е. (Горкі), Панталёва Я. Д. (Орша), Патаповіча А. А. (Барысаў), Котава Е. Е. (Магілеў), Гарадзецкага Д. І. (Горкі), Казнова Г. О. (Клімавічы), Лазукіна Ф. Я. (Орша), Макеенка В. П. (Асвея), Аўхімовіча І. В. (Барысаў), Абодава М. А. (Чавусы), Хоняка І. І. (Лепель), Куліка В. А. (Лёзна), Будрыка І. В. (Віцебск), Ганчарова С. Н. (Круглое), Хрыпача Е. І. Станкевіча І. П., Лейвікава Д. Н., Савосценка Г. Г., Жэляева П. І., Аксёнава А. А. (Магілеў); Шолахава Н. Н (Віцебск), Міліна Э. Ю. (Ушачы), Тучкоўскага К. М. (Ветрыны), Палтаўскага Я. Ф. (Клімавічы), Масалкова С. П. (Шклоў), Жаранкова А. Г. (Чэрыкаў), Гурко М. Ф. (Крычаў), Раманенка М. І. (Мсціслаўль), Клопава С. М. (Ушачы); Крупец М. Н., Грушэўскага І. Т., Машкарова Б. С. (Талачын); Зайцава І. Е. (Асвея).

Яўка вышэйуказаных таварышоў абавязкова. Прычым апошнія павінны прадставіць водзывы ад первічнай партарганізацыі аб сваёй апошняй рабоце.

Парткалегія пры упаўн. КПК па БССР

Паведамленні

17 мая, ў 8 г. вечара, у памяшканні райпартбацінета Каганавіцкага горрайкома КП(б)Б (Дом урада, V паверх, левае крыло, пакой 501) адбудзецца нарада спачуваючых скуранай прамысловасці Каганавіцкага раёна (фабрыка імя Кагановіча, фабрыка імя Куйбышэва, фабрыка імя Тэльмана і майстэрні індывідуальных заказаў).

18 мая, у 5 г. вечара ў садзе «Профінтэрн» арганізуецца МАСОЎКА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ і ўстаноў Сталінскага раёна, прысвечаная Дню друку.

ПРАГРАМА МАСОЎКІ:

1. Урачыстае пасяджэнне з дакладам аб Дні друку.
2. СУСТРЭЧА БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ З ЧЫТАЧАМІ. У сустрэчы прымаюць удзел Янка Купала, Андрэй Александровіч, І. Харык, Галавач і Гурскі.
3. Футбольны матч і валейбольныя спаборніцтвы для жадаючых.
4. РАЗВУЧВАННЕ МАСАВЫХ ПЕСЕНЬ у групах пад кіраўніцтвам артыстаў: Бары, Пігулеўскага, Ягорава і Сакалоўскага.
5. ВЯЛІКІ КАНЦЭРТ, арганізаваны радыёкамітэтам, кансерваторыяй, БДТ-1 з удзелам вялікага сімфанічнага аркестра, дзяржаўнай капелы, вакальнага ансамблю, вакальнага квартэта, рабочага хору кансерваторыі, ансамблю баяністаў і самадзейнасці завода імя Варашылава і інш.

Пасля канцэрта — масавыя ігры, танцы і фейерверк.

На пляцоўках працуюць атракцыёны, буфет, лодачная станцыя.

Спецыяльна абсталявана дзіцячая пляцоўка.

Усе прадпрыемствы, установы, калектывы, арцелі, жанты Сталінскага горраёна павінны паслаць сваіх прадстаўнікоў за атрыманнем білетаў у Сталінскі горрайком КП(б)Б.

Арганізаваны праход у сад да 5 гадзін вечара.

ПАРТКІМ РК КП(б)Б
РЭДАКЦЫЯ «ЗВЯЗДЫ»,
РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «РАБОЧЫ».

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-1 — 17 мая ПЛАТОН КРЭЧЭТ

Памяшканне Польскага тэатра (Совецкая, 17, тэл. 25-153) — Гастролі тэатра Чырвонай арміі БВА 17 мая В. Гусеў. СЛАВА

„Чырвоная Зорка" — Гукавы маст. фільм Радзіма клічА

„Пролетарый" — Гукавы маст. фільм ЭЛІСО

Кіно „Спартак" — Выдатны маст. фільм СаламандрА

Дзіцячы гукавы кінотэатр — Гукавы маст. фільм ЧАПАЕЎ

Менская арцель „ПЕРАМОГА" (Ракаўская, 26)

Мае для продажу:

штучны мёд, яблычнае цеста (цюрэ), дубовыя чаны розных размераў, тарныя сырыні з-пад яблык, дэкстрын для клею, лясны грабавы матэрыял, кандзіцерская граніт-ная вальцоўка, машыны для купорні бутэляк і поўны камплект абсталявання для воўначоскі

ПА ДАСТУПНЫХ ЦЭНАХ.

Арцелі ПАТРЭБНЫ: возчыні, чорнарабочыя, бондар, прыбіральшчыцы і некваліфікаваныя работніцы для работы ў цэхах.

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» — Ад 17 мая гукавы мастацкі фільм вытворчасці БЕЛДЗЯРЖКІНО

ШЛЯХ КАРАБЛЯ

Рэжысёр Ю. ТАРЫЧ

У галоўных ролях: заслуж. арт. ЧУВЕЛЕЎ, КАУРОЎ, Р. СВЕРДЛОВА, арт. Н. ПРАЗАРОЎСКІ, В. ЯБЛОНСКІ і ГАЛІНА КРАЎЧАНКА.

УНІВЕРСІТЭТ ДЛЯ СТАХАНАЎЦАЎ

(Комсамольская, 25, Дом тэхнікі)

18 мая Увечары лацэнт Л. І. Фіглоўская зробіць даклад на тэму: «Творчасць М. Шолахава», а таксама будзе разбор твораў «Паднятая цаліна» і «Ціхі Дон». Пачатак у 7 г. вечара.

Удзень лекцый не будзе. Працуе дзіцячы пакой.

РЭКТАРАТ.

БЕЛКААПМАЛАКО (Малочна-маслянае аб'яднанне — БЕЛКААПСАЮЗА) — выпусціла ў продаж масла „ЭКСТРА"

МАСЛА „ЭКСТРА" вырабляецца на заводах спажыўкаапераацыі з пастарызаваных сліваК лепшых гатункаў, мае найлепшы смак.

Як прыемна смак масла Экстра

ПАТРАБУЙЦЕ ва ўсіх магазінах масла «ЭКСТРА» нашай маркі, у гарадах:

Менску, Гомелі, Оршы, Магілеве, Полацку, Лепелі, Віцебску, Барысаве, Бабруйску, Мазыры, Рэчыцы.

у раёнах

Заслаўскім, Крупскім, Любаньскім, Смілавіцкім, Пухавіцкім, Чавускім, Халопеніцкім, Б.-Кашалеўскім, Веткаўскім, Добрушскім, Ламанавіцкім, Кіраўскім, Жлобінскім, Церахоўскім, Свяцілаўскім, Уваравіцкім, Дубровенскім, Дрыбінскім, Бялыніцкім, Горацкім, Круглянскім, Мсціслаўскім, Ленінскім, Пашніцкім, Галачынскім, Шклоўскім, Ушацкім, Асвейскім, Вешанковіцкім, Ветрынскім, Гаралоцкім, Расонскім, Суражскім, Дрысенскім, Мехаўскім, Сіроцінскім.

Да ведама ячэек МОПР гор. Менска

20 МАЯ гг. у клубе металістаў (вул. Кірава) у 7 гадзін вечара адбудзецца

ДРУГАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ЗБОРШЧЫКАЎ ЧЛЕНСКІХ УЗНОСАЎ І ШЭФГРЫВЕННІКА ЯЧЭЕК МОПР г. МЕНСКА І РАЁНА

з наступным парадкам дня:

1. Выкананне фінплана за 5 месяцаў г.г.
2. Уручэнне пераходнага сцяга лепшай ячэйцы.
3. Прэміраванне лепшых зборшчыкаў членскіх узносаў
4. Вялікі канцэрт.

Мандаты на канферэнцыю можна атрымаць у гаркоме МОПР (Совецкая, 87, II паверх).

МЕНСКІ ГАРКОМ МОПР.

Беларускі дзяржаўны політэхнічны інстытут абвяшчае НАБОР на 1936-37 навучальны год на агульнатэхнічны факультэт

Інстытут рыхтуе інжынераў па наступных спецыяльнасцях:

1. Інжынераў-будаўнікоў па арганізацыі вытворчасці будаўнічых работ,
2. Інжынераў-будаўнікоў па ацяпленню, вентыляцыі і цеплафікацыі,
3. Інжынераў-тэхнолагаў-механікаў.
4. Інжынераў-гідратэхнікаў-меліяратараў,
5. Горных інжынераў па торфу.
6. Інжынераў-хімікаў-тэхнолагаў сілікатнай прамысловасці.
7. Інжынераў-хімікаў-тэхнолагаў брадзільнай прамысловасці.

У інстытут прымаюцца грамадзяне ад 17 да 35 год, маючыя закончаную сярэднюю асвету, або атрымаўшыя атэстат аб сканчэнні сярэдняй школы ў парадку экстэрнату.

Паступіўшыя ў інстытут падлягаюць іспытам па ўстаноўленай праграме.

Прыём заяў аб залічэнні праводзіцца з 1 чэрвеня па 1 жніўня. Іспыты — з 1 па 20 жніўня.

Да заявы неабходна прыкласці: падрабязную аўтабіяграфію; атэстат аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы (у арыгінале); пашпарт (прад'яўляецца асабіста); засведчанне дакавай установы аб стане здароўя, не перашкаджаючага паступленню на адпаведны факультэт; дзве фотакарткі з подпісам, засведчаныя дзяржустановамі.

Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй, згодна існуючых правіл. Іншагароднія забяспечваюцца інтэрнатам. Сем'і студэнтаў жыллоплошчай не забяспечваюцца.

Дакументы накіроўваць па адрасу: г. Менск, Барысаўскі тракт, 55-а, дырэктару Беларускага політэхнічнага інстытута.

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА.

Аб'ява аб рэгістрацыі

НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯТАМ ФІНАНСАЎ БССР,

на падставе палажэння і правіл аб дзяржаўнай рэгістрацыі (Зборнік законаў і распараджэнняў урада СССР 1931 г., № 8, ст. 99 і Бюлетэнь фінансавага і гаспадарчага законадаўства 1931 года № 12),

14 мая 1936 г. зарэгістравана ў рэестры дзяржаўнай рэгістрацыі пад № 200-25 Беларускае аддзяленне „СОЮЗПРОДМАГА"

Адрас: г. Менск, Няміга, 8. Разліковы рахунак № 60038.

НАРКАМФІН БССР.

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА на другую палову 1936 г. на пяцідзённую газету „ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА"

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў і кіраўніцтва мастацтвам пры СНК БССР.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА» з'яўляецца кіруючым органам па пытаннях літаратуры, выяўленчага і тэатральнага мастацтва, музыкі, драматургіі і кіно-драматургіі, крытыкі.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА на газету «Літаратура і мастацтва» ў 1936 г.:
На 6 мес. (36 нумароў)—7 р. 20 к.
На 3 мес. (18 нумароў) — 3 р. 60 к.
На 1 месяц (6 нумароў) — 1 р. 20 к.
КОШТ АСОБНАГА НУМАРА 20 кап.

Падпіска прымаецца аддзяленнямі Саюздруку і Наркамсувязі.

АРГАНІЗАВАНАЕ ў гор. МЕНСКУ Беларускае аддзяленне Усесаюзнай дзяржаўнай канторы па аптова-рознічнаму гандлю школьна-пісьмовымі прыладамі і культтаварамі „СОЮЗКУЛЬТТОРГ" НКУГ СССР

Мае мэту аказання максімальнай дапамогі ў забеспячэнні ўсіх мясцовых гандлюючых арганізацый (ОРСы і інш.) школьна-пісьмовымі, канцэлярскімі, вучэбнаглядными дапаможнікамі і іншымі культтаварамі.

„СОЮЗКУЛЬТТОРГ"

АДКРЫЎ у Менску для РОЗНІЧНАГА ГАНДЛЮ школьна-пісьмовымі прыладамі і культтаварамі МАГАЗІН № 1 па Совецкай вул., 77 (памяшканне б. маг. ОДН), які ў бліжэйшы час будзе пашыран і пераабсталяван у тыпізаваны ўзорна-паказальны магазін.

Часова да адкрыцця ўзорнага культмага ў магазіне акрамя школьна-пісьмовых і канцэлярскіх тавараў таксама часткова праводзіцца продаж тавараў па групах фото, радыё, спорту, музыкі і цацак.

Паступіла вялікая партыя лепшых дзіцячых цацак.

У магазіне арганізован стол заказаў для дастаўкі тавараў на-дом.

Аптовыя заказы накіроўвайце у кантору Беларускага аддзялення СКТ — Рэвалюцыйная, 4. У канторы арганізован спецыяльны пакой з узорамі тавараў.

Усе даведкі можна атрымаць у канторы аддзялення, а таксама на базах і ў магазіне

Тэлефоны: канторы аддзялення — 25-499, 25-693, 25-482.
Цэнтральнай базы — 23-979.
Філіала цэнтральнай базы — 25-771.
Магазіна № 1 — 20-575.

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ «СОЮЗКУЛЬТТОРГ» НКУГ СССР.

Тыраж 90550 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Уп. Галоўлітбіта № Г—4770.